ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 83 (2136)
14 кастрычніка 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ТЫДЗЕНЬ ТАДЖЫКСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

ПАД СОНЦАМ БРАТЭРСТВА

Дарогамі дружбы, дарогамі братэрства прайшоў па нашай рэспубліцы Тыдзень таджыкскай літаратуры. Як наша сонца, якое ўсе гэтыя дні свяціла шчодра і ярка, сагравала зямлю, так цеплыня сэрцаў беларусаў сагравала сустрэчы з пасланцамі братняга Таджыкістана. Сівы Мір і юны Салігорск, блакітная Свіцязь і бацька Нёман, старажытны Гродна і легендарны Брэст выходзілі з хлебам-соллю і жывымі кветкамі насустрач дарагім гасцям.

Радасныя ўсмешкі і поціскі рук, песні прывітання і словы дружбы— усё гэта сведчыла аб тым, што Тыдзень таджыкскай літаратуры ў Беларусі стаў святам ўсенародным, святам еднасці і братэрства дзвюх літаратур, двух народаў.

Ажно не верыцца, што ўсяго нейкага паўстагоддзя назад паміж нашай сінявокай Беларуссю і горным Таджыкістанам ляжалі не толькі тысячы кіламетраў дарог, а і гады невядомасці аб жыцці адзін аднаго. Як цёмны, змардаваны царызмам беларус не ведаў таджыка, так і жыхар памірскіх кішлакоў не чуў пра беларуса. Песня Рудакі і Фірдоусі не далятала да Палесся, а песня Янкі Купалы і Якуба Коласа не гучала на берагах бурнага Вахша...

Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя, партыя Леніна вызвалілі народы ад нявольніцкага ярма, і адным з самых вялікіх дасягненняў Савецкай улады стала непарушная дружба народаў шматнацыянальнага Савецкага Саюза. Дружба гэтая скарацела кіламетры і адлегласці, зрадніла навекі рускіх і эстонцаў, казахаў і ўкраінцаў, грузін і латышоў, таджыкаў і беларусаў. Як родныя браты жывуць клопатамі адзін аднаго, так нашы народы жывуць аднымі справамі і імкненнямі. Іх яднаюць агульная вялікая мэта, агульныя ідэалы.

Дружба народаў выліваецца і ў дружбу літаратур сацыялістычнага рэалізму. На таджыкскай мове мілагучна і шырока гучаць творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова... На беларускай мове звініць слова Садрыдзіна Айні і Абулькасіма Лахуці, Мірзо Турсун-задэ і Мірсаіда Міршакара, Бакі Рахім-задэ і Амінджона Шукухі... Яны хвалююць сэрцы таджыкскіх і беларускіх чытачоў, натхняюць іх на подзвігі ў імя перамогі камунізма.

Тыдзень таджыкскай літаратуры ў Беларусі яшчэ раз засведчыў братэрства нашых народаў, нашых літаратур. Ён быў жаданым і радасным святам.

Сімвалічна, што апошні дзень Тыдня праходзіў у Брэсце, на зямлі, палітай крывёю сыноў усіх народаў нашай краіны, дзе побач з беларусамі мужна сустрэлі першыя ўдары фашысцкіх варвараў і браты таджыкі.

Вечарам 10 кастрычніка брэстаўчане запоўнілі залу Дома палітычнай асветы. У фае—столікі з кнігамі таджыкскіх пісьменнікаў на беларускай і рускай мовах. Рабочыя і студэнты, інжынеры і настаўнікі акружаюць пасланцоў таджыкскай літаратуры, гутараць з імі, просяць надпісаць на ўспамін кнігі.

Урачысты вечар адкрывае старшыня выканкома Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных І. М. Калілец. Ён горача вітае дарагіх гасцей на зямлі легендарнага Брэста, гаворыць аб тым, з якой радасцю сустракаюць працоўныя Брэстчыны літаратараў Таджыкістана, як з кожным днём мацнее і развіваецца дружба нашых народаў. Са словамі прывітання на вечары выступілі пісьменнік Уладзімір Калеснік, рабочы электралямпавага завода П. Тарасюк, студэнтка педагагічнага інстытута М. Бараховіч.

Слова бярэ кіраўнік дэлегацыі таджыкскіх пісьменнікаў Сатым Улуг-задэ. Ён гаворыць:

— На беларускай зямлі мы сустрэлі сардэчны, братэрскі прыём. Нас радуюць вашы поспехі ў працы, у развіцці нацыянальнай культуры, літаратуры і мастацтва. Вялікае дзякуй за гонар і павагу, аказаныя таджыкскай літаратуры...

Затым выступілі таджыкскія і беларускія пісьменнікі Гульчэхра Сулейманава, Еўдакія Лось, Мухідзін Фархат, Сяргей Грахоўскі, Бакі Рахім-задэ, Рыгор Барадулін, Мумін Канаатаў, Генадзь Бураўкін, Файзуло Ансары, Фатэх Ніязі, Іван Шамякін. Яны чыталі свае творы, гаварылі аб творчых сувязях беларускіх і таджыкскіх пісьменнікаў, аб вялікай ленінскай дружбе народаў савецкай краіны.

На ўспамін аб Брэсце І. М. Калілец уручыў таджыкскім літаратарам шкатулку са свяшчэннай зямлёй крэпасці-героя.

У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці.

11 кастрычніка госці развіталіся з Брэстам і вярнуліся ў Мінск. Іх прынялі ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР. За вялікую работу па правядзенню Тыдня таджыкскай літаратуры і Фестывалю таджыкскіх кінафільмаў у нашай рэспубліцы Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Указам ад 10 кастрычніка 1966 года ўзнагародзіў Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР групу дзеячоў таджыкскай літаратуры і мастацтва. Намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР І. Ф. Клімаў уручыў высокія ўзнагароды ўдзельнікам Тыдня таджыкскай літаратуры і Фестывалю таджыкскіх кінафільмаў, сардэчна павіншаваў іх і пажадаў новых творчых поспехаў.

Назаўтра ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі нашы літаратары прымалі сваіх таджыкскіх калег — удзельнікаў Тыдня таджыкскай літаратуры ў нашай рэспубліцы. Яны разам падвялі вынікі Тыдня.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль падкрэсліў, што для нашых пісьменнікаў і чытачоў, для ўсяго беларускага народа прыезд літаратараў Таджыкістана быў вялікай падзеяй. Ён выказаў упэўненасць, што ўзаемасувязі паміж пісьменнікамі Беларусі і Таджыкістана будуць мацнець і пашырацца з кожным днём, што гэта знойдзе сваё адлюстраванне і ў новых перакладах, і ў новых мастацкіх творах.

— Вынікамі Тыдня мы надзвычай задаволены, — сказаў кіраўнік дэлегацыі таджыкскіх літаратараў Сатым Улуг-задэ. — Тыдзень быў сапраўды народным. Мы адчувалі сябе гасцямі не толькі Саюза пісьменнікаў, а і ўсяго беларускага народа. Нас усюды сустракалі хлебам-соллю, радаснымі ўсмешкамі. Мы пераканаліся, што ў вас добра ведаюць Садрыдзіна Айні, Мірсаіда Міршакара, Мірзо Турсун-задэ і іншых таджыкскіх пісьменнікаў. Я думаю, што дружба наша будзе мацнець і пашырацца.

Сатым Улуг-задэ прапанаваў абменьвацца студэнтамі-філолагамі Таджыкскага і Беларускага універсітэтаў, каб мець магчымасць перакладаць творы таджыкскіх і беларускіх пісьменнікаў непасрэдна з арыгіналаў. Ён заклікаў таджыкскіх і беларускіх літаратараў, асабліва маладых, часцей прыязджаць адзін да аднаго, каб глыбей знаёміцца з гісторыяй і жыццём братніх народаў.

Абдуджабор Кахары гаварыў аб тым, што нашым выдавецтвам трэба больш аператыўна паспяваць за ростам літаратур, выдаваць усё лепшае, што ствараецца ў Беларусі і Таджыкістане. Ён адзначыў як вельмі радасны і сімптаматычны факт, тое, што ўсе кнігі беларускіх пісьменнікаў, выдадзеныя ў Душанбе ў мінулым годзе да Тыдня беларускай літаратуры ў Таджыкістане, разышліся, і ёсць неабходнасць некаторыя з іх перавыдаць. У планах выдавецтва, работнікам якога з'яўляецца А. Кахары, — зборнікі апавяданняў І. Шамякіна і Я. Брыля, кніга Т. Хадкевіча пра Беларусь, вершы нашага земляка, выдатнага польскага паэта А. Міцкевіча ў перакладзе на таджыкскую мову.

Сакратар Саюза пісьменнікаў Таджыкістана Фатэх Ніязі сказаў, што самае незабыўнае ўражанне Тыдня — беларускія чытачы, тысячы людзей, якія любяць і ведаюць таджыкскую літаратуру, цікавяцца кожным яе дасягненнем. Як сведчанне гэтай цікавасці, ён прачытаў пісьмо Сашы Макарэнкі з Капыльскага раёна, які дзяліўся сваёй радасцю ад сустрэчы з творамі класікаў таджыкскай літаратуры ў выдатным выкананні Махмуда Вахідава.

— Мы прывезлі да вас, — сказаў Фатэх Ніязі, — свае сэрцы, і частку іх мы пакідаем на вашай цудоўнай зямлі. Частку ж вашых сэрцаў, сэрцаў нашых братоў, мы павязём дадому, у сонечны Таджыкістан.

На сустрэчы выступілі таксама Іван Мележ, Алесь Асіпенка, Мікола Ткачоў.

Заўчора вечарам нашы госці развіталіся са сталіцай Беларусі.

Тыдзень таджыкскай літаратуры ў нашай рэспубліцы закончыўся. Ён быў плённым і ўрачыстым. Ён узбагаціў нашы веды аб зямлі і літаратуры сонечнага Таджыкістана, прынёс шмат хвалюючых і незабыўных сустрэч. Літаратары зямлі Фірдоусі і Хаяма адчулі цеплыню беларускіх сэрцаў, шчырую прыязнасць беларускіх братоў.

Тыдзень таджыкскай літаратуры ў Беларусі быў не толькі святам. Пісьменнікі дзвюх рэспублік яшчэ болей умацавалі свае творчыя сувязі, завязалі новыя асабістыя кантакты. Хочацца верыць, што ўсё гэта прынясе багаты плён, што з'явяцца новыя творы аб нашай дружбе, дружбе народаў-братоў.

Праводзячы таджыкскіх пісьменнікаў, беларуская зямля гаворыць ім:

— Да новых сустрэч! Хай мацнее з кожным днём дружба паміж таджыкскім і беларускім народамі!

Таджыкскія і беларускія пісьменнікі сабраліся ў Саюзе пісьменнікаў БССР, каб падвесці вынікі Тыдня таджыкскай літаратуры ў Беларусі.

УЗНАГАРОДЫ—ТАДЖЫКСКІМ СЯБРАМ

За вялікую работу па правядзенню Тыдня таджыкскай літаратуры і Фестывалю таджыкскіх кінафільмаў у Беларусі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пісьменнікаў Файзуло Ансары, Джалола Ікрамі, Муміна Канаатава, Абдуджабора Кахары, Фазлідзіна Мухамадзіева, Фатэха Ніязі, Шаўката Ніязі, Бакі Рахім-задэ, Абдумаліка Бахары, Гульчахру Сулейманаву, Сатыма Улуг-задэ, Мухідзіна Фархата, Расула Хадзі-задэ, артыста Таджыкскага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Лахуці Махмуда Вахідава, члена сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Таджыкфільм» Сайфулу Джурбаева, кінаактрысу Мар'ям Ісаеву, кінааператара Ібрагіма Барамыкава, першага сакратара Саюза кінематаграфістаў Таджыкскай ССР Барыса Кімягарава, галоўнага рэдактара кінастудыі «Таджыкфільм» Максуда Муладжанава, кінааператара Барыса Сярэдзіна.

На развітанне гаспадары і госці абмяняліся падарункамі. Пісьменнік Мікола Ткачоў уручыў таджыкскім сябрам партрэт Янкі Купалы. А госці на ўспамін пра свой прыезд падаравалі Міколу Ткачову таджыкскае нацыянальнае ўбранне.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

ЗАЛАТОЕ НАВАСЕЛЛЕ ДРЭЎ

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказвае кіраўнік Мінскага гарадскога трэста зялёнага будаўніцтва Ф. П. СМІРНОЎ.

Мы сядзім і гаворым аб дрэвах... Не аб стромкіх соснах і каржакаватых дубах, не аб палахлівай асіне і даўгавязым ясені, а аб дрэвах, што атрымліваюць пастаянную гарадскую прапіску. Субяседнік мой Фёдар Пятровіч Смірноў —тонкі знаўца дрэў. І не дзіва: толькі Мінскі гарадскі трэст зялёнага будаўніцтва ён узначальвае сем гадоў. Колькі тысяч дрэў, кустоў было пасаджана нават за гэты час у нашай сталіцы!

А дрэўцаў у Мінску прыбывае кожную восень, кожную вясну. Яны едуць сюды на машынах, беражна нясуць іх людзі на плячах. Вось і нядаўна бачыў я грузавыя машыны, на бартах якіх ярка гарэлі кучомістыя чупрыны ліпак. Значыць, залатое наваселле дрэў у сталіцы пачалося... Але адкуль, з якога лесу едуць да нас зялёныя навасельцы?

— Не, не з лесу,—усміхаецца Фёдар Пятровіч. —Уявіце сабе, калі б мы бралі саджанцы з лесу. Клопатаў колькі! Трэба было б падбіраць дрэўцы роўнага ўзросту, адпаведнага памеру. А ў нас ёсць свой спецыяльны гадавальнік дрэў і кустоў. Плошча яго немалая—150 гектараў. Знаходзіцца гадавальнік непадалёку ад Мінска, у раёне Ратамскай шашы. Вось і прывозім адтуль дрэўцы, адно да аднаго, як на падбор. Забяспечваем імі не толькі сваю гаспадарку, але і домакіраўніцтвы, прадпрыемствы, установы, школы, бальніцы, паасобных жыхароў— адным словам, усіх, хто пажадае. Гэтай восенню маем магчымасць адпусціць, як кажуць, «на старану» каля 50 тысяч маладых дрэў і 300 тысяч кустоў.

Я пытаюся ў кіраўніка трэста, колькі за гэтую восень будзе высаджана дрэў і кустоў у горадзе.

— Па колькасці высаджаных дрэў нават у нейкай ступені магчыма меркаваць па размаху жыллёвага і бытавога будаўніцтва. Вядома ж, што будзем азеляняць новыя вуліцы, мікрараёны, бо старыя ўжо азелянёны. Пасадкі пачаліся ўжо ў мікрараёнах Зялёны Луг, у раёне вуліцы Арлоўскай, па Ратамскай шашы... Азеляніл нядаўна каштанамі вуліцы ў раёне Магілёўскай шашы—Працоўную, Ангарскую, імя Філатава, клёны пасадзілі па вуліцы імя Крапоткіна. Упершыню ў Мінску абсадзілі бярозкай адзін бок вуліцы Волгаградскай. Сёлета трэст плануе высадзіць на вуліцах 35 тысяч дрэў і каля 150 тысяч кустоў.

Калі Фёдар Пятровіч сказаў, што ў Мінску пачынае «прапісвацца» краса беларускага лесу—бярозка, мяне навяло на думку спытацца, якія ж пароды дрэў будуць высаджвацца на гарадскіх вуліцах.

— Ліпа—гэтае дрэва стала сімвалічным для нашага горада, як каштан для Кіева. Яно прыгожае, добра прымаецца. Акрамя таго, на гарадскіх вуліцах высаджваюцца клёны, каштаны, рабіна, сіняя елка. І як я сказаў ужо, упершыню сёлета пасадзілі бярозкі. Калі яны добра прымуцца, а ў гэта мы верым, дык будзем іх садзіць і надалей. Дарэчы, аб прыжывальнасці дрэў. За апошнія гады яна значна павялічылася, нягледзячы на тое, што раней мы высаджвалі дрэвы 8—10-гадовага ўзросту, а цяпер 15—16-гадовага.

— У некаторых гарадах на вуліцах высаджваюцца і пладовыя дрэвы. А як у нас?

— Пладовых дрэў на вуліцах мы не высаджваем, хоць у нашым гадавальніку і ёсць дзічкі, якія можна было б акультурыць. Думаю, што пладовыя дрэвы на вуліцах Мінска садзіць не варта. Яны мала даюць ценю, дрэнна прымаюцца там, дзе ёсць асфальт, засмечваюць яго... Яблыні, грушы, вішні лепш садзіць у дварах, а вуліцам патрэбна пышная зеляніна.

Мы часта бачым на вуліцах роднага Мінска людзей, якія садзяць, даглядаюць дрэвы, кусты. Гэта творцы прыгажосці, настрою людзей. Як я даведаўся з гутаркі, пасадкай, доглядам нашых зялёных сяброў у горадзе займаецца 100 чалавек—спецыялістаў, рабочых трэста. Я папрасіў Фёдара Пятровіча назваць некалькіх перадавікоў.

— Добрых працаўнікоў у нас шмат. Многія з іх працуюць тут доўгі час. Вось хоць бы Вазміціева Тацяна. Больш за пятнаццаць гадоў садзіць яна дрэвы. Уявіце, колькі іх пасадзіла Тацяна Васільеўна за сваё жыццё! Цяпер яна ўзначальвае брыгаду па пасадцы дрэў. Перадавыя ў трэсце брыгады Ганны Любянок, Тацяны Цырла і іншых.

Гэта людзі, якія садзяць дрэвы, ствараюць прыгажосць. А ёсць іншыя людзі— псуюць гэту прыгажосць. Пра іх з абурэннем гаварыў Фёдар Пятровіч:

— Можна было б прывесці шмат фактаў, калі з-за безадказнасці, нядбайнасці некаторых кіраўнікоў будаўнічых арганізацый былі загублены дрэвы. Закладваецца фундамент дома—часта ніхто не зважае на зялёныя насаджэнні, капаецца катлаван пад каналізацыю, газіфікацыю—таксама не звяртаюць увагі на іх, шмат драў шафёры калечаць... Ды і асобныя грамадзяне, дзеці, ломяць, псуюць дрэвы, падпоркі да маладых саджанцаў. Гэта браканьерства ў горадзе!

І яшчэ прасіў кіраўнік трэста зялёнага будаўніцтва, каб газета «Літаратура і мастацтва», якая вядзе пастаянную рубрыку «Чалавек і прырода», часцей пісала не толькі аб сельскай прыродзе, а і аб прыродзе горада.

...Вось і скончылася наша гутарка аб дрэвах з «гарадской прапіскай». Я пакідаю ўтульны, у засені зеляніны домік над Свіслаччу, дзе знаходзіцца гарадскі трэст зялёнага будаўніцтва. Я праходжу па вуліцах Мінска, пабалал якіх стаяць роўныя шарэнгі дрэў. Высокія, стройныя, яны сыплюць пад ногі залатое лісце. Магчыма, яны пасаджаны той жа самай Тацянай Вазміцієвай... А яна і яе сяброўкі дзесьці садзяць новыя дрэўцы. Ліпы, каштаны, клёны, рабіны... Працягваецца залатое наваселле дрэў, каб вясною ў магутны зялёны шум беларускай сталіцы ўліўся новы пошум маладой лістоты.

С. БЛАТУН.

У Беларусі праходзяць Дні навукі і тэхнікі Польскай Народнай Рэспублікі. У рэспубліканскай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна адкрылася выстаўка польскай навукова-тэхнічнай літаратуры.

НАВУКА ПЛЮС МАСТАЦТВА

Нядаўна ў адной з залаў Дома мастацтваў сабраліся мастакі, акцёры, студэнты Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, вучоныя Акадэміі навук БССР, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў. Тут адбыўся чарговы дыспут-абмеркаванне. Работнікаў мастацтва і навукі цікавіла, як ідзе працас творчасці ў мастакоў і вучоных, якую ролю адыгрывае эмацыянальнае ў рабоце вучоных і рацыянальнае ў рабоце мастакоў. Дыспут праходзіў без загадзя намечанай праграмы, без пэўнага рэгламенту і дакладаў, і гэта стварыла шчырую сяброўскую атмасферу.

Тут жа было прынята рашэнне праводзіць такія сустрэчы і надалей, абмяркоўваць на іх і тэарэтычныя праблемы творчасці мастакоў і вучоных, і канкрэтныя творы. У прыватнасці, было вырашана ў бліжэйшы час абмеркаваць спектакль Рускага драматычнага тэатра імя Горкага «Фізікі-лірыкі».

Першыя сумесныя вечары вучоных і работнікаў мастацтва паказалі, што гутаркі-абмеркаванні прыносяць пэўны плён, яны ўзаемна ўзбагачаюць, дапамагаюць у творчай рабоце.

32 выезды самадзейных артыстаў

У цэнтры вёскі Жыцькава стаіць двухпавярховы Палац культуры. Вечарамі тут ідуць заняткі. Сельскія артысты рыхтуюць чарговую канцэртную праграму.

Сёлета калектыў мастацкай самадзейнасці калгаса зрабіў ужо 32 выезды ў вёскі Барысаўскага раёна. Самадзейныя артысты выступаюць з вадэвілямі, інсцэніроўкамі, песнямі, частушкамі. На канцэртах поспехам карыстаюцца свінаркі Зінаіда Чарнуха і Зінаіда Васілеўская, бібліятэкар Марыя Гігевіч і іншыя.

Р. БОХАН.

ЗБІРАЛЬНІКІ МОЎНЫХ СКАРБАЎ

Вось ужо шосты год запар у час летніх канікулаў накіроўваецца ў цікавае падарожжа дыялекталагічная экспедыцыя Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага. У яе складзе студэнты філалагічнага і літаратурна-музычнага факультэтаў.

Сёлета студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыцы З. Блінавай пабывалі ў Любанскім раёне. Удзень і па вечарах збіральнікі моўных скарбаў запісвалі прымаўкі і прыказкі, фразеалагічныя выразы, народныя песні.

Багаты матэрыял сабралі будучыя філолагі. Зараз ён, як і ў папярэднія гады, знаходзіцца на кафедры роднай мовы, дзе вядзецца апрацоўка яго. Удзельнікі дыялекталагічнага гуртка рыхтуюць на аснове яго даклады, пішуць курсавыя работы.

У хуткім часе будзе складзены дыялекталагічны слоўнік слуцка-бабруйскіх гаворак.

П. ЛАСТАЎКА.

ВУЧАЦЦА МУЗЫЦЫ ДЗЕЦІ КАЛГАСНІКАЎ

Пры Міжлескім сельскім клубе Бярозаўскага раёна нядаўна пачаў працаваць музычны гурток. Яго на грамадскіх асновах вядзе загадчыца клуба Кацярына Шэпка. Сама яна скончыла Гродзенскае культасветвучылішча, любіць музыку, добра валодае музычнымі інструментамі і нотнай граматай.

Па праграме музычнай школы ў гуртку цяпер займаецца больш за 20 вучняў — дзяцей калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны сцяг».

Я. СЯЛЕНЯ.

НА СРОДКІ КААПЕРАТАРАЎ

З кожным годам расце ў рэспубліцы сетка кніжных магазінаў спажывецкай кааперацыі. Нядаўна расчыніл свае дзверы перад пакупнікамі кнігарні ў Мікашэвічах (Лунінецкі раён), Новым Двары (Мінскі раён), Росі (Ваўкавыскі раён) і іншыя. Прыгожыя, згодна з тыпавымі праектамі, узводзяцца будынкі спецыялізаваных магазінаў у Нясвіжы, Краснаполлі.

Усяго сёлета запланавана на сродкі спажывецкай кааперацыі пабудаваць сорак кнігарняў.

НА ПАЛОТНАХ РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ

У Доме культуры гарадскога пасёлка Брагомль адкрылася выстаўка работ самадзейнага мастака Уладзіміра Нікадзімавіча Сакалова. Большасць іх — гэта пейзажы, на якіх адлюстраваны лясы, азёры і пералескі роднага краю.

Мастак невыпадкова апявае свае мясціны. Ён доўгі час працаваў у лясной гаспадарцы, назіраў прыроду ў яе велічы і хараство. Свае ўражанні ён занатоўвае цяпер у карцінах.

С. МІКАЛАЙЧУК.

МЕЛЬПАМЕНА І ТЭХНІКА

Калі вы сёння зойдзеце ў памяшканне Беларускага тэатра оперы і балета, вас адразу апануе роспач. Я мяркую па сабе. Неяк вельмі цяжка прызвычаіцца да таго, што вось зусім нядаўна тут усё зіхацела, у кожным кутку адчуваўся святочны настрой, той асаблівы настрой, які бывае толькі ў тэатры, а цяпер усё перавернута дагары нагамі. Сапраўдны вэрхал. На падлозе — кучы вапны і пяску, горы дошак, абрыўкі паперы... Грукат, віск, маланка электразваркі. Усё гэта на месцы, дзе нядаўна былі фае, глядзельная зала, сцэна.

Адным словам, калі раней вы нават часта хадзілі ў оперны тэатр, цяпер тут нічога не пазнаеце.

Пра ўсё гэта я гавару дырэктару тэатра Фёдару Георгіевічу Жыгалаву. Ён усміхаецца:

— Калі ўсё будзе прыведзена ў парадак, здаецца, і тады нашы пастаянныя гледачы не пазнаюць тут многага. Вельмі зменіцца інтэр'ер. Што іменна? Гардэроб (выбачайце, што я пачынаю з гэтага, але ж вядома, што тэатр пачынаецца з вешалкі) размесціцца цяпер на цокальным паверсе. А то, памятаеце, дзе ён быў? У фае. Нязручна, як кухня ў пакоі.

Не пазнаеце вы і глядзельнай залы. Не, памеры тыя ж, але афармленне... Крэслы. Зручныя і вельмі прыгожыя — з чырвонага дрэва. 1 500 такіх крэслаў. Памятаеце цяжкія плюшавыя парцьеры, што былі павешаны на кожным кроку? Дык гэтых збіральнікаў пылу ўжо не будзе. Ложы будуць упрыгожаны парцьерамі з лёгкіх сучасных тканін...

На кожным паверсе — холы, абсталяваныя сучаснай мэбляй. Адным словам, афармленне інтэр'ераў тэатра праводзіцца пад дэвізам — лёгка, зручна, прыгожа.

— Фёдар Георгіевіч, я чуў, што пасля рэканструкцыі сцэны тэатра яна будзе унікальнай па свайму тэхнічнаму аснашчэнню...

— Гэта праўда. Але пра гэта вам лепш раскажа наш галоўны мастак Яўген Рыгоравіч Чамадураў.

Пасля першых жа слоў Яўгена Рыгоравіча мне становіцца ясна, што ён жыве гэтай справай.

— Вы, відаць, згодзіцеся са мной, што сучасны оперны ці балетны спектакль — гэта не толькі майстэрства артыстаў, гэта яшчэ і вялікая тэатральная тэхніка. Вось гэтага нам раней не хапала. Як адразу пасля вайны адрамантавалі тэатр, так на тым узроўні ўсё і было. Перамяніць дэкарацыі? Уручную. Асвятленне? Уручную варочалі цяжкія сафіты. Ды і светлавая магутнасць была недастатковая. Усё гэта ставіла пастаноўшчыкаў, рэжысуру, акцёраў у цяжкія ўмовы.

Ну, а цяпер будзе зусім, зусім іншае. Пачну з галоўнага. Гэта так званая накатная фура памерам 17,5 на 17,5 метра з упісаным у яе паваротным кругам дыяметрам 16 метраў. На гэтай фуры загадзя ўстанаўліваецца дэкарацыя, на ёй могуць быць загадзя пабудаваны цэлыя мізансцэны, і ўсё гэта ў час спектакля, нават на вачах у гледача накатваецца з глыбіні сцэны. Праўда, такія фуры ёсць у некаторых еўрапейскіх тэатрах, але там яны рухаюцца па накіроўваючых рэйках. А рэйкі гэтыя псуюць планшэт сцэны, ствараюць перашкоды для танцораў. У нас фура будзе рухацца на спецыяльна скансструяваных катках, абутых у гуму. Гэта прымяняецца ўпершыню ў сусветнай тэатральнай тэхніцы.

Але гэта яшчэ не ўсё. Сцэна будзе аснашчана трыма хадамі-лініямі, кожная — 100 метраў даўжыні. Што такое лінія? Загадзя недзе за кулісамі ўстанаўліваецца дэкарацыя, лесу, напрыклад. Вам трэба паказаць, што герой едзе ў аўтамабілі міма гэтага лесу. І вось аўтамабіль стаіць нерухома на сцэне, а лес з пэўнай хуткасцю бяжыць міма яго, аж цэлых сто метраў бяжыць. Ствараецца поўная ілюзія руху аўтамабіля. Здорава? Цяпер пішыце ў сваю кніжачку далей. Падлога сцэны абсталюецца чатырма з'ёмнымі планшэтамі-люкамі. Уяўляеце? Пад сцэнай рухаецца спецыяльная машына, яная ў любы момант можа падняць артыста на паверхню сярод сцэны. Ці той жа артыст можа раптам «праваліцца», як той Мефістофель... Нанава манціруецца фантанная ўстаноўка, устаноўка, што пусае пару, дым, агонь і г. д.

Я ледзь паспяваю запісваць і час ад часу паглядаю на Яўгена Рыгоравіча: можа, усё? Але дзе там. Галоўнага мастака не спыніць.

— Вы нічога не запісалі пра асвятленне...

І ён вядзе мяне ў суседні пакой, дзе знаёміць з загадчыкам пастаноўчай часткі тэатра Б. П. Талалаевым.

— Барыс Пятровіч, раскажыце карэспандэнту пра электрагаспадарку, «забіце» яго лічбамі.

Барыс Пятровіч «забівае»:

— Калі выцягнуць у адну лінію ўсю электраправодку сцэны, дык яна зойме 700 кіламетраў. І яшчэ. Усяго на сцэне будзе ўстаноўлена ні многа, ні мала — 150 матораў, якія будуць прыводзіць у рух усе механізмы. Магутнасць асвятляльнай часткі сцэны павялічваецца ў тры разы.

Барыс Пятровіч расказвае і расказвае. Сцэна абсталёўваецца сямю новымі сафітамі, якія аснашчаны люмінесцэнтнымі лямпамі. У глыбіні планшэта сцэны прадугледжана унікальная выстаўная механічная рампа для падсвету гарызонту. А спецыяльныя асвятляльныя галерэі, а сістэма пражэктараў, а праекцыйныя апараты, зробленыя для тэатра чэхаславацкімі і нямецкімі сябрамі, а унікальны чатырохпраграмны рэгулятар, які рухае ўсю гэту тэхніку... Не, усяго не пералічыш. Я збіраюся класці ў кішэню запісную кніжку — досыць...

— Тэатр будзе абсталяваны ўнутраным службовым тэлебачаннем, — знарок спакойна ўступае Я. Р. Чамадураў.

— Унутраным тэлебачаннем? А навошта?..

— Навошта? — перапытвае Яўген Рыгоравіч. — Во! Вы такі ж, як некаторыя... Навошта, маўляў, такая раскоша, жылі без тэлебачання...»

Я пачынаю апраўдвацца, што нічога не меў на ўвазе, што... Галоўны мастак не дае мне гаварыць.

— Вы ведаеце, як раней было? Напрыклад, па ходу дзеяння хор павінен спяваць за сцэнай. А дырыжор дзе? Дырыжор на сваім месцы ў арнестры. Дык як яму кіраваць хорам, як харыстам сачыць за дырыжорам? Рабілі так. Памочнік дырыжора стаяў за кулісамі і глядзеў праз якую-небудзь шчыліну на дырыжора. Той узмахваў рукамі — падаваў знак хору — і памочнік яго капіраваў, а яшчэ адзін памочнік, што стаяў ужо непасрэдна перад хорам, капіраваў жэсты першага памочніка. Можна сабе ўявіць, якая атрымлівалася сінхроннасць. А цяпер перад харыстамі будзе пастаўлены тэлеэкран, па якім яны будуць бачыць дырыжора.

Другі канал будзе перадаваць усё, што робіцца на сцэне і ў зале, у памяшканні, дзе знаходзіцца рэжысура, пастаноўшчыкі і г. д. Дадамо, што ўнутраная тэлеўстаноўка мае выхад і ў эфір.

— І радыёгаспадарка вялікая ў нас будзе, — устаўляе Талалаеў. — Раней спявак вымушан быў знаходзіцца амаль увесь час на пярэднім краі сцэны, каб яго чулі ў зале. Прыходзілася так рабіць нават тады, калі па ходу дзеі яму належыць стаяць ці хадзіць недзе ў глыбіні сцэны. Цяпер уся сцэна будзе абсталявана мініяцюрнымі мікрафонамі. Спявай на здароўе, дзе хочаш, цябе пачуюць у самым далёкім кутку залы...

— Ну, і калі ўсё гэта стане явай?

— У студзені—лютым.

— І апошняе пытанне, наконт самага «другараднага» — творчай работы тэатра ў гэтым юбілейным годзе.

Мяне перадаюць па «канвееру» мастацкаму кіраўніку тэатра, народнаму артысту БССР Дзмітрыю Мікалаевічу Смолічу.

— Наш калектыў папоўніўся некалькімі маладымі артыстамі — спевакамі і танцорамі — выпускнікамі беларускіх мастацкіх навучальных устаноў. Што датычыцца рэпертуару, дык мы цяпер рыхтуем спектаклі «Пер Гюнт», «Багема», «Князь Ігар», «Лебядзінае возера». Да пяцідзесяцігоддзя Савецкай улады гледачу будуць паказаны новая рэдакцыя оперы «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага, аднаактовы балет Я. Глебава «Альпійская балада» па аднайменнай аповесці В. Быкава, опера К. Малчанава «Брэсцкая крэпасць». Пішуць для тэатра Г. Вагнер, Ю. Семяняка.

М. ЗАМСКІ.

НАРАДЫ ПА ТЭХНІЧНАЙ ЭСТЭТЫЦЫ

У Баранавічах з дырэктарамі прамысловых прадпрыемстваў праведзены семінар па тэхнічнай эстэтыцы і культуры вытворчасці. З дакладам выступіў начальнік навукова-даследчага аддзела Беларускага філіяла інстытута тэхнічнай эстэтыкі М. Эрман.

Удзельнікі семінара пазнаёміліся з выстаўкай, на якой былі прадстаўлены малюнкі інтэр'ера Баранавіцкага тэкстыльнага камбіната, узоры рабочага адзення, прадукцыя розных прадпрыемстваў горада. Былі прагледжаны фільмы «Тэхніка і прыгажосць», «Святло і колер» і іншыя.

Канферэнцыя па навуковай арганізацыі працы і культуры вытворчасці адбылася ў Крычаве. У ёй прынялі ўдзел дырэктары і галоўныя інжынеры прадпрыемстваў, эканамісты, партыйныя і прафсаюзныя работнікі. Былі заслуханы даклады па навуковай арганізацыі працы і культуры вытворчасці. Работнікі прадпрыемстваў Крычава і Магілёва падзяліліся вопытам работы ў гэтым напрамку на сваіх заводах і фабрыках.

Выступае ансамбль «Надзея».

НА БЛАКІТНЫХ ЭКРАНАХ

І Сож, і Дзясна, і Дняпро

Ні то вечар, ні то раніца. Здаецца, вечар, бо зморанаму ўжо не пад сілу расплюшчыць вочы, вылезці на халадок з-пад цёплай капы сена, а такая ж прыемная мелодыя плыве па рацэ, што пранікае ў душу нават праз сон:

Люблю бярозку белую,
Дняпро, і сіні гай,
І бляск азёр над вёскаю, —
Цябе, мой родны край...

А мо і раніца, бо над Дзясной паволі растае туман, агаляючы крутыя берагі, пад вопратку прабіраецца свежасць расы, і аднекуль па вадзе наплывае песня:

Выйдешь к Десне, глянешь вокруг—
Сказочный край мой родной.
Шепчется лес, шепчется луг
С резвой деснянской волной...

Ці мо поўдзень. Бо толькі што на рачных абалонах было поўна людзей, стракацелі белыя кашулі, белыя хустки, а цяпер толькі копы тырчаць і чутна па-дзявочы вельмі ж ужо кранальная мелодыя.

Ой піду я лугом, стежкою, в'юнкою,
Де червоні ружі, як мое літа...

Усё гэта, зведанае то ў рыбацкіх, то ў сваіх журналісцкіх вандроўках, свежа адгукнулася ў памяці, калі я глядзеў перадачу Гомельскай студыі тэлебачання «Галасы сяброў» (рэдактар Мікола Бандарэнка, рэжысёр Ірына Матросава).

Даўно ўжо стала традыцыяй, што на мяжы трох рэспублік-сяцёр—Расіі, Украіны і Беларусі—сустракаюцца, дзеляцца планамі, справамі і песнямі працоўныя Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей; даўно стала звыклым, што на берагах Сожа аднолькава хораша гучаць рускія і ўкраінскія песні, як і свае родныя, а над Дняпром і Дзясной—нашы, беларускія.

Новы размах, яшчэ мілейшую прывабнасць, больш глыбокі змест набывае гэтае гучанне сёння, у пярэдадзень 50-годдзя Савецкай улады.

Перадача «Галасы сяброў» — часцінка вялікага фестывалю самадзейнага мастацтва — бясспрэчны поспех студыі. Яна арыгінальная па задуме, захапляючая па афармленню, радасная па гучанню. Нездарма ж — а гэта не так часта і надараецца—перадача выйшла на ўсесаюзны блакітны экран.

Вось на экране група Азершчынскага народнага хору. Нядаўна гэты калектыў адзначыў сваё трыццацігоддзе, і на юбілейным свяце шмат самых цёплых і прачулых слоў было сказана і ў адрас Таццяны Карнееўны Лапацінай, заснавальніцы хору, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Калектыў з гадамі не старэе. Наадварот, з году ў год ён папаўняецца маладымі талентамі, яго рэпертуар, не губляючы набытага, ад канцэрта да канцэрта папаўняецца адчувальнай свежасцю. Сведчанне таму—хаця б і вось гэтае выступленне па тэлебачанні. Побач з песнямі «Любы край, мая Азершчына», «Люблю бярозку белую» хораша прагучала і новая — «Скрыпка і бубен». Музыку да яе напісалі ў хоры.

Вопыт пройдзенага, свежасць сённяшняга — вось, бадай, асноўнае, што характарызуе Азершчынскі народны хор. Багатае, неспакойнае, бо вечна ў пошуках, жыццё калектыву. Рыхтуючыся да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, тут асабліва чуйна прыслухоўваюцца да новых мелодый. Таму і невыпадкова, што сярод мноства самабытных самадзейных мастацкіх калектываў Гомельшчыны музычная рэдакцыя тэлестудыі аддала перавагу гэтаму — Азершчынскаму.

Не менш цікавы і ансамбль бандурыстак Чарнігаўскага будаўнічага трэста № 4. Ансамбль з поўным на тое правам можна назваць «Надзеяй». Па-першае, таму, што сапраўды на гэты малады мастацкі калектыў можна ўскладваць самыя высокія спадзяванні. Па-другое, у яго саставе—Надзея Дацэнка, Надзея Уласенка, Надзея Баравік, Надзея Рэкун, Надзея Буглак. Ансамбль з пяці Надзей хораша дапаўняюць Марыя Голуб і Галя Халецкая. Усе дзяўчаты скончылі прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча, працуюць цяпер тынкоўшчыцамі і малярамі на будоўлях Чарнігава.

Пад уласны акампанемент дзяўчаты праспявалі «Таполю», «Чырвоную ружу», «Вось ужо трэці вечар» — па-ўкраінску міла, па-маладому шчыра і ўзнёсла і—з прафесіянальным майстэрствам. Выступленне ўкраінскіх бандурыстак—адна з цікавейшых старонак перадачы.

Парадавалі і рускія сябры. З горада Навазыбкава на студыю прыехалі Уладзімір Чарнабаеў, Панас Прупес і Віталій Цюпіч. Яны—дружбакі з маленства. Разам вучыліся ў школе, разам скончылі Навазыбкаўскі педагагічны інстытут, а цяпер настаўнічаюць у родным горадзе. І вось ужо дванаццаць гадоў разам спяваюць. Песні «Край мой родны», «Сын», «Чатыры капуцыны», якія выканалі яны па тэлебачанні, — толькі кропля з іхняга цікавага рэпертуару. Пазнаёміцца з гэтым самадзейным трыо, паслухаць яго — сапраўды і радасць і асалода.

Трэба адзначыць, што перадача «Галасы сяброў» будавалася не дзеля адной толькі арыгінальнасці. Яна з'явілася на экране яшчэ і таму, што пад радыусам панаслася на экране яшчэ і таму, што пад радыусам паназу студыі знаходзіцца значная тэрыторыя Браншчыны і Чарнігаўшчыны. Нават без выхаду на Маскву суседзі маюць магчымасць кожны дзень глядзець перадачы Гомеля. І, безумоўна, вельмі добра, што ў гэтыя дні музычная рэдакцыя пачала знаёміць сваіх гледачоў з самадзейным мастацтвам сяброў-суседзяў.

Перадача «Галасы сяброў» цікавая і патрэбная. І, пэўна ж, пасля чарговай «лятучкі» яна будзе адзначана як лепшая за тыдзень. А ўсё ж назваць яе бездакорнай нельга. Маленькі рэдактарскі недагляд — і маленькая прыкрасць. А гэта ўжо непска. У сябе дома можна быць і больш строгім пры адборы і рэдагаванні. Якую эстэтычную нагрузку могуць несці словы накшталт вось гэтых:

Не пайду я ў РДК,
А пайду ў клуб у БМУ...

Для Азершчыны яны мо і маюць якую гісторыю. А для песні? Іх не тое, што спяваць, іх і вымавіць цяжка, як кажуць, язык вывіхнуць можна. І тут рэдактару варта было калі не апусціць гэтыя нядалыя словы, дык зусім замяніць песню. А ў азершчынцаў жа ёсць што на замену.

Няхай гэтая маленькая заўвага будзе толькі як напамінак на будучае, бо планы музычнай рэдакцыі студыі вялікія, яны абяцаюць гледачам шмат хвалюючых і прыгожых хвілін. У бліжэйшы час тут выступяць самадзейныя артысты Петрыкаўскага, Брагінскага, Рагачоўскага і іншых раённых дамоў культуры, рыхтуюцца перадачы з сельскіх клубаў, пакажуць сваё майстэрства рабочыя заводаў і будоўляў. І — не адзін яшчэ раз прывязуць на студыю свае песні рускія і ўкраінскія суседзі.

Іван КІРЭЙЧЫК.

У магілёўскі кніжны магазін № 3 прыходзяць пісьмы з розных куткоў Савецкага Саюза — Далёкага Усходу, Сібіры, Поўначы, Украіны. І ва ўсіх пісьмах просьба выслаць тую ці іншую кнігу. Гэты здымак зроблены, калі работнікі магазіна Т. Тараскіна, В. Балашова, В. Фёдарава рыхтавалі да адпраўкі чытачам чарговую партыю літаратуры.

„ПОЛЫМЯ"? НЕ, НЕ ЧУЛІ...

ЧЫТАЧЫ «Літаратуры і мастацтва», пэўна, памятаюць невялікую дыскусію, якая ўзнікла на старонках газеты ў мінулым годзе вакол артыкула дацэнта кафедры беларускай літаратуры БДУ імя Ул. І. Леніна А. Лойкі «А гэта ж былі лепшыя». Гаворка ў ім ішла аб тым, што многія, нават лепшыя выпускнікі сярэдніх школ, часта не ведаюць творчасці і жыццёвага шляху вядомых беларускіх пісьменнікаў, асноўных этапаў развіцця роднай літаратуры, не ўмеюць вызначаць тэму і ідэю твораў і ўвогуле мысляць аб літаратуры занадта схематычна. Самае слабое месца ў ведах выпускнікоў школ, на думку А. Лойкі, «гэта беднае знаёмства іх з сучаснай літаратурай, з лепшымі творамі сённяшняй прозы і паэзіі».

А. Лойка, а таксама іншыя выкладчыкі вну і настаўнікі школ, якія адгукнуліся на артыкул «А гэта ж былі лепшыя», называлі прычыны, што абумоўліваюць гэтую слабасць ведаў выпускнікоў па роднай літаратуры. У прыватнасці, яны называлі такія прычыны: яўна недастатковая колькасць гадзін, што адводзіцца на вывучэнне курса ў школах, нізкая якасць падручнікаў па літаратуры, адсутнасць хрэстаматый і кніг праграмнай літаратуры і г. д.

Усё гэта, вядома, правільна. Аднак ёсць і яшчэ адна важная прычына, якой, дарэчы, не аддалі ўвагі ўдзельнікі памянёнай дыскусіі. Што ж гэта за прычына?

НЕ ТАК даўно давялося мне быць у Мар'інай Горцы, Бабруйску і Рагачове. Мэта маёй паездкі была самая звычайная, можа нават крыху сумнаватая: цікавіўся, як разгортваецца ў гэтых раёнах падпіска на беларускія літаратурна-мастацкія выданні. Адразу ж скажу, што ніякіх асаблівых падстаў для таго, каб ехаць менавіта ў гэтыя раёны ні Мар'іна Горка, ні Бабруйск, ні Рагачоў не давалі. Па колькасці выпісваемых экземпляраў «Полымя», «Беларусі», «Маладосці», «Літаратуры і мастацтва», «Нёман» яны сярод іншых раёнаў рэспублікі — сераднячкі. І маршрут маёй паездкі быў выбраны проста па карце: па-першае, Мар'іна Горка, Бабруйск і Рагачоў ляжаць на адной магістралі, па-другое, спакушала тое, што гэтыя раёны, калі можна так сказаць, прадстаўнікі розных абласцей: Пухавіцкі, —Мінскай, Бабруйскі — Магілёўскай, Рагачоўскі — Гомельскай. Менавіта гэтая акалічнасць падштурхнула мяне выбраць такі маршрут.

Цікавіўся я ведамаснай падпіскай, а сярод прадпрыемстваў і ўстаноў аддаваў перавагу школам. Чаму? Да таму, што ў рэдакцыю неаднойчы паступалі сігналы аб тым, што ў многіх школьных бібліятэках не знойдзеш «Полымя», «Маладосці», «Беларусі».

І вось прайшло больш тыдня, як у маім камандзіровачным пасведчанні былі пастаўлены пухавіцкая, бабруйская і рагачоўская пячаткі, а я ўсё не магу знайсці слоў, якімі можна было б расказаць пра тое, што ўбачыў і пачуў у гэтых трох раёнах трох абласцей, бо гэтае пачутае і ўбачанае настолькі незразумелае, проста-такі неверагоднае, што, як кажуць, не ўкладваецца ў галаве.

Пухавіцкі раён. У раёне — 50 сярэдніх і васьмігадовых школ. З іх выпісваюць «Беларусь» — 4 школы, «Полымя» — 10, «Маладосць» — таксама 10, «Літаратуру і мастацтва»— 6.

Бабруйскі раён (без горада). Сярэдніх і васьмігадовых школ тут 29. І, зноў-такі, лягчэй пералічыць тыя з іх, якія хоць што-небудзь выпісваюць. Так, «Маладосць» сёлета атрымліваюць 3 школы, «Літаратуру і мастацтва» — 4, «Полымя»—1.

Рагачоўскі раён. З сарака чатырох сярэдніх і васьмігадовых школ сёлета не атрымліваюць ні «Полымя», ні «Маладосці», ні «Беларусі», ні «Літаратуры і мастацтва» трыццаць дзве!

Зрабіўшы вышэй нагаданую выбарку ў Пухавіцкім аддзяленні «Саюздрук», я, прызнаюся, не паверыў сваім вачам. Не можа, маўляў, быць таго, каб большасць школ не мела ў сваіх бібліятэках часопісаў на роднай мове. Як жа гэта так? Хто ж і як выкладае там родную літаратуру? Урэшце, хто ў гэтым вінаваты? Што гэта — звычайная нядбайнасць ці нешта горшае?

Начальнік аддзялення «Саюздрук» Н. Ляўшукова тлумачыць такое становішча тым, што, маўляў, школы маюць мала сродкаў. Прычына, вядома, сур'ёзная. Але пагадзіцца з ёй нельга. Бо вось жа яны, перада мной, заяўкі школ. Сярод шматлікіх выданняў амаль у кожнай заяўцы — поўны пералік прадметных часопісаў: «Литература в школе», «Математика в школе», «Биология в школе», «Преподавание истории в школе», «Иностранный язык в школе» і г. д. Чаму гэтыя выданні выпісваюцца за дзяржаўныя сродкі? Прадметныя ж часопісы разлічаны на аднаго, у крайнім выпадку на двух-трох чалавек! Не будзе лішнім сказаць і таго, што гонар кожнага настаўніка — самому выпісаць свой прадметны часопіс. Далей—болей. У некаторых заяўках даводзілася бачыць, напрыклад, часопіс «Дальний Восток» і нават «Журнал мод»...

Міжволі складваецца ўражанне, што сродкаў няма менавіта на беларускія літаратурна-мастацкія выданні.

Спрабую супакоіць сябе тым, што, можа, гэта толькі сёлетні год такі няўдзячны для іх, што, можа, на будучы год будзе зусім іншая карціна — кожная школа выпіша.

Падпіску на 1967 год у Пухавіцкім раёне афармілі на той час яшчэ не ўсе школы, але многія ўжо даслалі свае заяўкі ў аддзяленне «Саюздрук». Знаёмлюся з імі. Карціна тая ж самая — кропелька ў кропельку. Зноў у пераважнай большасці заявак не знайшлося месца ні для «Полымя», ні для «Маладосці», ні для «Беларусі», ні для «Літаратуры і мастацтва».

Расказваю пра ўсё гэта загадчыку Пухавіцкага раённага аддзела народнай асветы А. Юркевічу. Андрэй Міхайлавіч адразу са мной пагаджаецца:

— Канечне, канечне, гэта наша ўпушчэнне. На будучы год мы гэтую справу паправім. З васьмігадовымі цяжэй, іх фінансуюць сельсаветы, а ім я загадаць не магу. А вось сярэднія школы абавязкова выпішуць.

І ён тут жа, пры мне, выклікаў па тэлефоне бухгалтара і аддаў распараджэнне ўнесці ў заяўкі сярэдніх школ беларускія літаратурна-мастацкія выданні.

— Дык, Андрэй Міхайлавіч, заяўкі ўжо здадзены ў «Саюздрук».

— А-а-а, — загадчык райана крыху збянтэжыўся, але тут жа паправіўся: — Ну, нічога, што-небудзь прыдумаем. На першай жа нарадзе дырэктараў школ абавяжам іх, каб «Полымя», «Маладосць» і іншыя беларускія выданні былі ў школьных бібліятэках.

Не верыць Андрэю Міхайлавічу не было ніякіх падстаў. Але...

Зайшоў я ў першую Мар'інагорскую школу. Гутару з дырэктарам. Ён таксама пагаджаецца, што, сапраўды, школьная бібліятэка павінна мець і «Полымя», і «Маладосць», і нашу газету, але тут жа дастае з-пад шкла на стале разнарадку на газеты і часопісы, якія павінны выпісаць на будучы год школы раёна. Разнарадка за подпісам Андрэя Міхайлавіча Юркевіча. І што ж? Ніводнага з беларускіх літаратурна-мастацкіх выданняў у гэтым спісе няма. Вось тут і пахіснулася мая вера ў шчырасць абяцанняў загадчыка райана.

Дарэчы, у гэтай жа школе я зайшоў у дзевяты клас, пагутарыў з дзевяцікласнікамі. Пасля знаёмства пытаюся, якія часопісы і іншыя літаратурныя выданні яны ведаюць.

«Юность»... «Сельская молодежь»... «Работница»... «Романгазета»...

— Ну, а, напрыклад, «Маладосць»? Хто з вас чытае?

— «Маладосць»? — перапытвае смялейшы хлапчук. — Здаецца, недзе бачыў. Ага, у раённай бібліятэцы. Не, мусіць, у кіёску...

— А часопіс «Полымя»? Такі часопіс ведаеце?

— «Полымя»? Не, такога не чулі...

Мілыя, даверлівыя, дасціпныя тварыкі, шчырыя пагляды! Любыя хлопчыкі і дзяўчынкі! Цяжка мне з вамі гаварыць. Вы яшчэ ў такім узросце, што не разумееце, які цікавы, захапляючы свет праходзіць міма вас, які скарб духоўных вы губляеце па віне раўнадушных дзядзькоў і цётак, якія абавязаны дбаць аб вашым станаўленні, аб вашым розуме і душы...

Усё магчымае абяцаў зрабіць і загадчык аддзела агітацыі і прапаганды Пухавіцкага райкома партыі М. Б. Сіпач. Што ж, дай бог чутае бачыць, хоць, прызнаюся, не дужа ўжо хацелася верыць гэтым абяцанням. Бо як я ні стараўся заўважыць, што такое становішча хоць каго-небудзь з таварышаў (з кім давялося ў Пухавічах гаварыць) устрывожыла, усхвалявала, заўважыць гэтага не ўдалося. І абяцанні іх выглядалі самымі звычайнымі адчэпкамі: маўляў, калі табе так хочацца, дык можам і паабяцаць, язык не адваліцца...

Такое ж ураджанне засталося ў мяне і ад гутарак з адказнымі таварышамі ў Бабруйскім і Рагачоўскім раёнах. Гэтак жа ахвотна паабяцалі зрабіць усё магчымае, каб школьныя бібліятэкі мелі беларускія літаратурна-мастацкія выданні, і інспектар Бабруйскага райана І. Ганчарык (самога загадчыка ўбачыць мне не давялося), і загадчык Рагачоўскага райана Л. Масальскі.

Той факт, што 32 з 44 школ раёна не выпісваюць беларускіх часопісаў, Леаніда Паўлавіча Масальскага настолькі не ўзрушыў, што пры гаворцы са мной ён, па сутнасці, нават не злез з матацыкла, адаслаў у педкабінет — маўляў, пытаннямі падпіскі займаюцца там.

Загадчыца педкабінета Дора Маркаўна Мілер перапытала:

— І нават «Полымя» не выпісалі? Ай-яй-яй! Быў у нас тут нейкі пісьменнік, мусіць, з «Полымя», бо ўсё агітаваў за «Полымя». Дык мы прасілі дырэктараў школ выпісаць «Полымя». Значыць, не паслухаліся... Можа, вы самі паходзіце па школах?

Дора Маркаўна зняла тэлефонную трубку і пазваніла ў школу № 1:

— Сяргей Браніслававіч? Як там у вас з падпіскай? Яшчэ не афармлялі? Ага, дык, будзьце ласкавы, выпішыце «Полымя», «Маладосць» і «Літаратуру і мастацтва». Што, кажаце, чытаць не будуць? І ўсё ж выпішыце...

Сяргей Браніслававіч Асташкевіч — дырэктар першай Рагачоўскай школы. Гэта ён упэўнены, што «Маладосці» і «Полымя» не будуць чытаць ні настаўнікі, ні вучні старэйшых класаў. Пераконваць яго, што ён памыляецца, мне не хацелася. Рашыў лепш пад'ехаць у якую-небудзь вясковую школу.

І вось я ў Гадзілавіцкай дзесяцігодцы. Гутару з групай дзесяцікласнікаў. Сімпатычныя дзяўчаткі і хлопцы, як і дзевяцікласнікі з Мар'інагорскай школы, не здолелі назваць ніводнага з выданняў нашага Саюза пісьменнікаў, успомніць ніводнага прачытанага твора на беларускай мове.

І яшчэ адно. Індывідуальная падпіска, вядома, справа прыватная. Тым больш цяпер, калі падпіска не абмяжоўваецца. Што хочаш — тое і выпісвай. І ўсё ж дзіўна, што толькі нямногія выкладчыкі роднай літаратуры выпісваюць літаратурна-мастацкія часопісы на беларускай мове. Дакладныя звесткі пра індывідуальных падпісчыкаў атрымаць цяжка: для гэтага трэба было б абзвоньваць усе сельскія паштовыя аддзяленні. Аднак сёе-тое можна падлічыць і без гэтага. Так, у Пухавіцкім раёне, паўтараю, пяцьдзесят сярэдніх і васьмігадовых школ. Як мінімум, у кожнай з іх — па аднаму выкладчыку роднай літаратуры. А па індывідуальнай падпісцы на раён ідзе толькі 5 (пяць!) экземпляраў «Полымя». Пяць індывідуальных падпісчыкаў на раён! Калі дапусціць нават, што ўсе яны — настаўнікі, выкладчыкі роднай літаратуры, дык гэта таксама не радуе...

Думаю, што цікавыя і такія моманты. Начальнік Пухавіцкага раённага аддзялення «Саюздрук» Н. Ляўшукова ў гутарцы са мной заўважыла:

— Сёлета праводзіць падпіску сярод культасветустаноў лягчэй, чым у ранейшыя гады. У нас ёсць абавязковы спіс выданняў для бібліятэк і клубаў, складзены і зацверджаны Міністэрствам культуры. Таму мы папраўляем іншых загадчыкаў клубаў ці бібліятэк, калі яны не ўключаюць у свае заяўкі названых выданняў. На жаль, Міністэрства асветы рэспублікі скласці такі спіс не паклапацілася.

Але ўсё ж у Бабруйску амаль ва ўсіх заяўках школ, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў значацца «Полымя», «Маладосць», «Беларусь» і «Літаратура і мастацтва». Праўда, я тут жа звярнуў увагу на тое, што назвы беларускіх выданняў унесены ў заяўкі іншай рукой. Начальнік гарадскога аддзялення «Саюздрук» Вольга Васільеўна Габрус растлумачыла:

— Упісваем. Нялёгка даводзіцца, але ўпісваем. Бо што ж гэта такое? Хто ж будзе чытаць гэтыя часопісы, хто ж іх будзе ведаць, калі іх не будзе нават у бібліятэках? У школьных, напрыклад. Калі людзі не разумеюць ці не хочуць разумець гэтага, дык іх і паправіць можна і трэба. Вось і папраўляем. Сварымся, але папраўляем. Бібліятэкі павінны мець беларускія часопісы. Гэта — зыходзячы з дзяржаўных інтарэсаў.

Правільна разважае і, дадам, правільна паступае Вольга Васільеўна. Канечне ж, падпіска — справа дзяржаўная, і лёс яе павінен вырашацца з улікам дзяржаўных інтарэсаў...

БЕЛАРУСКАЯ літаратура, асабліва літаратура апошніх гадоў, дасягнула небывалага росквіту. Лепшыя творы нашых паэтаў і празаікаў карыстаюцца шырокай папулярнасцю, і любоўю сярод чытачоў, перакладзены на дзесяткі моў народаў свету і ўвайшлі ў духоўную скарбніцу чалавецтва. Дык чаму ж мы так бяздумна, абыякава ставімся да яе лёсу? Чаму ж мы, нібы знарок, не дапускаем да гэтых скарбаў нашага чытача, у прыватнасці, вучняў старэйшых класаў? Што гэта — звычайная абыякавасць, неразуменне таго, што родная літаратура — магутнейшы сродак патрыятычнага, камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення, ці, можа, пагарда?

Хацелася б пачуць адказ на гэтыя пытанні з Міністэрства асветы рэспублікі.

Мікола ГІЛЬ,
спецкарэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

З нашай пошты

САЛІГОРСКУ—СТУДЫЮ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

Леанід Літвінаў працуе на рудніку Першага Салігорскага калійнага камбіната. Апрача сваёй асноўнай работы, гарняку даводзіцца афармляць насценныя газеты, наглядную агітацыю, маляваць сатырычныя лісткі. Адначасова Леанід захапляецца маляваннем. Самадзейны мастак піша маслам, малюе алоўкам, у яго ёсць акварэльныя работы. Шахцёры камбіната добра знаёмыя з карцінамі, эцюдамі, замалёўкамі мастака-аматара.

Нядаўна ў гарадскім кінатэатры адкрылася выстаўка работ мастакоў Салігорска. Палотны, эцюды і замалёўкі, якія экспануюцца на выстаўцы, прыцягваюць увагу шахцёраў і будаўнікоў. У сваіх творах самадзейныя мастакі адлюстроўваюць працоўныя будні салігорцаў, шматграннае жыццё роднага горада, яго маляўнічыя ваколіцы.

На выстаўцы нямала партрэтаў, пейзажаў, акварэляў. Выкананы яны рознымі людзьмі—у выстаўцы ўдзельнічаюць мастакі Л. Літвінаў, Н. Малаш, Б. Касценка і іншыя. Выстаўка карыстаецца поспехам. Пра гэта сведчыць кніга водгукаў, старонкі якой запоўнены добразычлівымі словамі, парадамі, пажаданнямі ярчэй і больш выразна расказваць пра жыццё і працоўныя справы салігорцаў.

Ёсць у кнізе водгукаў і слушныя прапановы, ажыццяўленне якіх памагло б мастакам-аматарам больш актыўна разгарнуць работу. Напрыклад, стварыць у Салігорску студыю выяўленчага мастацтва. У горадзе ёсць нямала людзей, якія захапляюцца маляваннем і якім патрэбна дапамога, атрымаць яе можна было б у студыі выяўленчага мастацтва. Але пакуль што ў Салігорску такой студыі няма.

У юбілейным 1967 годзе Салігорск атрымае цудоўны падарунак—Палац культуры, і такім чынам будзе рэальная магчымасць адкрыць студыю выяўленчага мастацтва. Але пра гэта трэба паклапаціцца сёння, каб забяспечыць студыю спецыялістамі, якія аказвалі б практычную кваліфікаваную дапамогу мастакам-аматарам. Самадзейныя мастакі Салігорска чакаюць дапамогі ад Саюза мастакоў рэспублікі.

Н. САЛАУЁЎ.

У майстэрнях мастакоў

КАБ ЗАГАВАРЫЛА ДРЭВА

Мастак Ул. БАСАЛЫГА.

— Вось усё, што я паспеў зрабіць за тыя некалькі дзён, што быў у Брэсце.

Уладзімір Басалыга дастаў з шафы вялікую кардонную скрынку, паставіў на стол і адчыніў. Вочы ў мяне разбегліся. У скрынцы, не жартуючы, была цэлая вёска народа.

Вось на лакіраваным чыстым стале стаяць музыканты. Цэлы хор — у два рады на падмостках, з дырыжорам і баяністам. Фігуркі маленькія, точаныя з дрэва, з невялікімі падмалёўкамі гуашшу. Калі глядзіш на іх, міжволі ўсміхаешся. Не таму, што рысы жывых людзей утрыраваны. Проста глядзіш і адчуваеш добрую ўсмешку мастака. Фігуркі яшчэ не пакрыты лакам. Натуральная і не бліскучая бяроза здаецца цёплай, прыемна дакрануцца да фігурак і крыху павярнуць іх—яны на шпянёчках і варочаюцца.

Некідкія гуашавыя фарбы ўжыты вельмі сціпла—толькі тонкімі лініямі прамаляваны рукі, адзенне, валасы, твары. Дзе-нідзе зроблены невялічкія колеравыя плямкі.

Яшчэ адна група—«Сваты». Таксама цэлая кампазіцыя. Людзі толькі што ўвайшлі ў хату, нават яшчэ не зачынены дзверы за імі. Малады—высокі, тонкі, цыбаты, стаіць ззаду, ён крыху праставаты, разгублены, а на першым плане прысадзістыя сват і свацця з ручнікамі цераз плячо. І тут адчуваецца добры, незласлівы гумар. Формы не кроплепадобныя, як у «харыстаў». Фігуркі таксама апрацаваны на такарным станку, але тут ужыта спалучэнне цыліндраў, асабліва ў вырашэнні сватоў, — ад гэтага яны атрымаліся больш прысадзістыя і смешныя.

На стале з'яўляюцца ўсё новыя і новыя кампазіцыі. Высокі хлопец у чорным капелюшы і ў паласатых штанах прыйшоў на спатканне з дзяўчынай; ля калодзежа, паставіўшы долу вёдры, вядуць свае бясконцыя размовы дзве маладзіцы; сядзіць на лавачцы і прадзе кудзелю папрадуха. А вось два будзёнаўцы—бравыя, ясныя, у астраверхіх зялёных шлемах. З самага нізу скрынкі Уладзімір дастае тонкую бярозавую дошку, з бакоў няроўную, — там толькі знята кара. На ёй выразаны рэльеф — пастушок іграе на жалейцы...

Мы доўга разглядалі новыя работы. У вырашэнні сцэнак, у пастаноўках, у саміх фігурках знойдзены добрыя гумарыстычныя ноты, ёсць цёплыня аўтарскага погляду.

— У мяне было трынаццаць малюнкаў,— гаворыць Басалыга,—а выканаў у матэрыяле толькі сем. Не паспеў. А яшчэ выразаў русалку. А для дыпломнай работы (Уладзімір вучыцца ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце) думаю зрабіць ільва...

Пра ільва ён гаворыць у разліку на нечаканасць. Відаць, не раз каму казаў і заўсёды здзіўляў субяседнікаў:

— Дзе ж ты ў Беларусі бачыў ільвоў?

— А нідзе. І людзі не бачылі. Але ў нейкіх народных творах ёсць гэты экзатычны звер. У яго па дзве-тры грывы, хвост недзе на баку—смешны такі звер.

Уладзімір задаволена ўсміхаецца.

— Відаць, у людзей ёсць часам імкненне да незвычайнасці, — гаворыць ён. — Вы паглядзіце, як птушку робяць народныя майстры. — Ён паказвае малюнак стылізаванай птушкі, у якой хвост зроблены з кругоў і прамых ліній, і наогул уся птушка з'яўляецца часткай арнаменту. — Гэта не райская птушка, не певень—проста птушка. І я хачу неяк у такім плане зрабіць свайго ільва.

Мастак гаворыць хутка, пабліскваючы чорнымі вачыма, горача даказвае...

Уся гэтая частка нашай гутаркі датычыць уласна творчасці. Але Уладзімір не «свабодны» мастак—ён працуе ва ўпраўленні мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці. Упраўленне аб'ядноўвае многія народныя промыслы—разьбу па дрэву, ткацтва, інкрустацыю, кераміку, пляценне. Гэта ў нас цэлая галіна вытворчасці. Не так даўно «Літаратура і мастацтва» пісала, што ў рэспубліцы забываюцца старыя народныя промыслы. І вось сёння яны ў асноўным аб'яднаны на фабрыках мастацкіх вырабаў. Але тут адразу ўзнікае шмат новых праблем. Не будзем закранаць справы керамічныя, ткацкія і іншыя. Возьмем толькі работу па дрэву. Да сённяшняга часу ў сур'ёзнай тэарэтычнай літаратуры з'яўляюцца скаргі на тое, што мастакі, народныя майстры не заўсёды ўдала падаюць дрэва. Прыёмы чыста народнай разьбы, як гэта робяць у нас некаторыя народныя майстры, занадта часта ўжываюцца, і сёння сталі нецікавымі. Мы пачалі аддаваць перавагу драўляным рэчам, якія больш паказваюць само дрэва—яго тэкстуру, цікавыя выгібы, пэўную прыгажосць паверхні, словам, пачынаем больш цаніць не вонкавы дэкор, не апрацоўку паверхні, а натуральнасць матэрыялу. Вось чаму многія майстры імкнуцца як мага менш ужываць роспіс і разьбу. У гэтым напрамку ідзе пошук і ва Уладзіміра Басалыгі. Тыя цікавыя формы, што ён знайшоў у сваіх новых творах, сведчаць, што аўтар адчувае матэрыял, яго магчымасці.

Тое, што зрабіў Уладзімір,—узоры, якія будуць выпускаць фабрыкі мастацкіх вырабаў. Гэта павінны быць сувеніры. Відаць, некаторыя з іх пойдуць і ў Канаду, на Сусветную выстаўку. На брэсцкай фабрыцы майстры хутка падыдуць да сваіх такарных станкоў, і тысячы точаных з дрэва «Сватоў» і «Маладзіц ля калодзежа» запоўняць нашы магазіны. І на працягу якога года або двух адбудзецца імгненная маральная ўцэнка цікавых узораў.

— Не, не, трэба выпускаць толькі невялікімі партыямі і серыямі,—гаворыць Басалыга. — Нельга даводзіць узор да таго, што мы зараз маем у нашых магазінах.

Уладзімір мае на ўвазе драўляныя вырабы, што выпускаюць фабрыкі іх сістэмы. Многія з іх цікавыя, але іх занадта многа, і яны, мякка кажучы, абрыдзелі. Да таго ж, многія рэчы пакрыты непразрыстымі гуашавымі фарбамі—адразу не здагадаешся, што гэта дрэва. А жоўты густы лак, якім апрацаваны точаныя з дрэва фігуркі, робіць іх халоднымі, яны здаюцца пластмасавымі.

— І тут жа праблема лаку,—гаворыць Уладзімір. Мае фігуркі трэба нечым пакрыць—гуаш пэцкаецца. Дарэчы, нам трэба адмовіцца і ад гуашы, трэба ўжываць нейкія празрыстыя фарбы, каб дрэва прасвечвала. Але нашаму міністэрству не даюць добрых фарбаў, лаку. І як пакрыюць усё гэта жоўтым лакам...

Гэта цэлая праблема, якую трэба вырашыць. Да сённяшняга дня мы лічым, што лепшы лак трэба аддаваць мэблевай прамысловасці, а народныя промыслы абыдуцца і адыходамі. А лак—гэта праблема мастацкіх якасцей нашых сувеніраў, многія з якіх ідуць не толькі па Саюзу, але і за мяжу.

— А як жа быць з масавасцю?—пытаю ў Басалыгі. — Каб яе не было, трэба ўвесь час рабіць і рабіць човыя ўзоры.

— Мастак! — коратка адказвае Уладзімір. — Трэба, каб на брэсцкай фабрыцы быў мастак па дрэву і ўвесь час рабіў узоры. Я працую і жыву ў Мінску. Калі я там вырвуся і паеду ў Брэст! І ўсё наспех. А трэба, каб мастак на сваім прадпрыемстве працаваў пастаянна.

Па сутнасці, мы дрэва толькі пачалі асвойваць у мастацкай прамысловасці. Амаль няма ў нас яшчэ ўзораў дэкаратыўнага посуду. Мала цікавых сувеніраў і рэчаў унікальных, серыйных і малатыражных. Мы нясмела выкарыстоўваем для гэтых мэт розныя пароды дрэў, не навучыліся падаваць сасну, мала ўжываем матэрыялы, цікавыя па сваёй тэкстуры.

Мае рацыю Уладзімір Басалыга. Вельмі ўжо мала мастакоў, народных майстроў працуе ў нас па дрэву, мала цікавых пошукаў. А матэрыял гэты багаты, магчымасці ў яго вялікія, рэзервы мастацкія яшчэ далёка не выкарыстаны. Нашы інтэр'еры чакаюць аздаблення цёплым і арыгінальным дрэвам.

В. ГОВАР.

3 літаратурных аб'яднанняў

ЗНАЁМСТВА З РАБОТАЙ ВЫДАВЕЦТВА

Члены літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі газеты «Во славу Родины» сустрэліся з загадчыкам рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь» Алесем Бажко. Ён расказаў армейскім літаратарам пра работу выдавецтва, пра яго сувязі з пісьменніцкім актывам, пра рукапісы, што знаходзяцца цяпер у партфелі рэдакцыі, пра работу з маладымі аўтарамі.

А. Бажко пазнаёміў членаў літаратурнага аб'яднання з планамі выдання зборнікаў нарысаў, апавяданняў, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка.

З прапановамі і заўвагамі ў адрас выдавецтва на пасяджэнні выступілі маладыя армейскія літаратары І. Александаў, А. Уманец, М. Стручын, П. Бажон, М. Гольдман, І. Карнієнка і іншыя.

СЛОВА—ПАЭТАМ

Над прыгажуняй Дзвіной у Полацку вырас Курган Бяссмерця. Насыпаны ён гэтым летам у гонар тых, хто гераічна загінуў у суровых бітвах з фашысцкімі захопнікамі. Тэма мужнасці, гераізму савецкіх людзей натхніла пачынаючага полацкага паэта Уладзіміра Іванова: ён напісаў верш «Курган Бяссмерця». Гэты верш нядаўна апублікаваны ў «Літаратурнай старонцы» раённай газеты «Сцяг камунізма».

На гэты раз уся літаратурная старонка аддадзена паэтам. Свае новыя вершы друкуюць слесар Іосіф Дзербан, размотчыца завода шкловалакна Раіса Івашчонак, выпускнік сярэдняй школы Фёдар Зязюля, служачыя Станіслаў Лапіч, Уладзімір Ліхачоў.

У ГАСЦЯХ—БРАТ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

Цікава праходзяць пасяджэнні літаратурнага аб'яднання пры гродзенскай раённай газеце «Сельская новь». Тут і разгляд твораў пачынаючых літаратараў, і сустрэчы з пісьменнікамі, селькорамі, і шчырыя таварыскія гутаркі на «агеньчыках» за круглым сталом.

Нядаўна рэдакцыя раённай газеты запрасіла да сябе ў госці брата Змітрака Бядулі Мацвея Яфімавіча Плаўніка. Ён расказаў членам літаратурнага аб'яднання пра дзіцячыя і юнацкія гады пісьменніка, пра яго творчасць.

ГУЧАЦЬ ПЕСНІ

Са сцэны Браслаўскага раённага Дома культуры не раз ужо гучала песня «Браслаўская лірычная». Яе напісаў член літаратурнага аб'яднання пры раённай газеце настаўнік П. Руднікаў. Музыку да яе стварыў дырэктар мясцовай музычнай школы Ул. Манкевіч. Ён таксама член літаратурнага аб'яднання, плённа супрацоўнічае з маладымі паэтамі. Набыла ў раёне папулярнасць і другая яго песня на словы мясцовага паэта Ул. Арлова — «Прыгожыя азёры Браслаўскія».

Малады паэт Уладзімір Карызна да таго ж яшчэ і самадзейны кампазітар. Яго песні таксама з поспехам выконваюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці.

Гэтымі днямі адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання пры раённай газеце. Члены яго думаюць стварыць вялікую літаратурна-музычную кампазіцыю, прысвечаную 50-годдзю Савецкай улады. У ёй знойдуць адлюстраванне падзеі з 1917 года па сённяшні час. Мяркуецца, што кампазіцыя ўвойдзе ў рэпертуар гурткоў мастацкай самадзейнасці раёна, якія ўсё шырэй разгортваюць падрыхтоўку да фестывалю самадзейнага мастацтва.

ДОБРАГА ЎЗЛЁТУ!

З таго часу, як у Лоеўскае педагагічнае вучылішча прыйшлі працаваць выпускнік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна А. Дудко і выхаванец Мінскага педінстытута імя М. Горкага А. Кукара, цікавым стала тут літаратурнае жыццё. Было створана студэнцкае літаратурнае аб'яднанне «Узлёт». Члены яго праводзяць вечары, дыспуты, абмяркоўваюць свае творы, рыхтуюць падборкі для літаратурных старонак у раённую газету. Праяўляюць свае здольнасці пачынаючыя паэты студэнты А. Мурашка, Л. Кулажанка, Г. Бурлата, выкладчык А. Кукара і іншыя.

«У нас у гасцях—літаратурнае аб'яднанне «Узлёт»—пад такой рубрыкай Рэчыцкая раённая газета пазнаёміла сваіх чытачоў з творчасцю студэнтаў у сваім пастаянным альманаху «Прыдняпроўе».

Сярод кніг

НЕСПАКОЙНАЯ ЦІШЫНЯ

«Тры цішыні»—так называецца новы зборнік Анатоля Вярцінскага, так называецца верш з гэтага зборніка, які даў назву ўсёй кніжцы.

Якія ж яны, тыя тры цішыні? Адна «вечаровая»—«тая, што як маг», другая—«цішыня-паўночніца» і «дум бяссонных памочніца»...

І ёсць цішыня світальная,
ёсць яшчэ цішыня
першага вітання
першага агня.
Яна заводзіць гадзіннікі
і разам з імі яна
пазвоньвае, падзіньквае,
і — трубіць цішыня.
Трубіць ціша світальная
у свой сярэбраны рог,
заве ў далі дальнія,
да новых спраў і дарог.
Трубіць ціша світальная,
крыштальная, развітальная,
і патанае яна
у вадаспадзе дня.

Ці пераканаў нас паэт? У фармальных разліках хутчэй за ўсё не пераканаў. Захацеўшы, можна налічыць больш, чым тры цішыні. Паэт абмінуў, напрыклад, цішыню пустыні, цішыню магілы, якія таксама нешта гавораць чалавечаму духу. А той, хто прывык усё ў жыцці зводзіць да простага, скажа, што цішыня адна, і таксама будзе мець рацыю, бо па граматычных законах слова «цішыня» не мае множнага ліку. Але А. Вярцінскі пераканаў нас у іншым—пераканаў у тым, што якраз праз яе, неадназначную цішыню, якая захапіла яго сваім нераскрытым сэнсам, ён можа выказаць вельмі пэўнае і тыповае для нашага сучасніка адчуванне сённяшняга жыцця. У вершы «Тры цішыні» выяўляецца настраёвасць баявой душы, якая хоць і прагне цішыні, але цішыні асаблівай—той цішыні, што пабуджае чалавека да роздуму, цясней звязвае яго духоўна з усім чалавецтвам і з'яўляецца прыкметай абнаўлення, гранню, за якой пачынаецца нараджэнне новага дня, поўнага лепшых надзей.

Надзея сустрэць новы, амалоджаны дзень менш за ўсё выглядае ў зборніку А. Вярцінскага звычайнай дэкларацыяй, хоць ён дзе-нідзе не адмаўляецца і ад дэкларацыйнага, адкрыта публіцыстычнага пафасу. Галоўнае ў тым, што паэт імкнецца прасвятліць рэальны змест гэтых падзей праз паэтычны роздум. Наогул можна сказаць, што самая характэрная рыса паэзіі А. Вярцінскага—роздум, які нават не грэбуе быць блізкім да празаічнага разважання. Праўда, часам вобразы ў вершах А. Вярцінскага рацыяналізуюцца настолькі, засушваюцца да таго, што становяцца вяла празаічнымі месцамі (верш «Мне ўяўляецца гэта так»). Аднак рацыяналізм як агульны мастацкі прыём, як стылістычная форма адносін паэта да жыцця дае А. Вярцінскаму вельмі плённую перспектыву. Узнікае магчымасць гаварыць аб наватарскіх пошуках сучаснай беларускай паэзіі. Такі стылявы кірунак уключае беларускае слова ў новы рытм мастацкай апрацоўкі, надае вершу якасці, якія яшчэ недастаткова развіліся ў беларускай паэзіі.

У вершы «Бар'еры» узнята такая складаная сацыяльная праблема, што можа здацца, быццам яна падыходзіць толькі для артыкула ці рамана. Паэт гаворыць аб неадпаведнасці тэхнічнага прагрэсу ўзроўню сацыяльнага жыцця і тэмпам маральнага ўдасканалення людзей. Сапраўды, у стылі верша ёсць нешта ад сухасці трактата, але гэта паэзія—паэзія розуму і роздуму:

Вучоны муж!
Я рады, павер,
я ганаруся тваёй працай.
Толькі ёсць у мяне непакой:
ці хутка дойдзе чарга да бар'еру
глухой адчужанасці людской,
неразумення і недаверу?
Калі ён падзе—
ракавы, векавы—
на нашых шляхах у новыя эры,
як некалі паў бар'ер гукавы,
як падаюць іншыя бар'еры?

Інтэлектуальная зацікаўленасць паэта сённяшнім часам надзвычай шырокая. Сцвярджэнне складанасці жыцця («Статак вяртаецца з поля») і пропаведзь гуманізму («Ленінскі смех»), заклік да дзейнасці і інтэлектуальнай актыўнасці («Да пытання аб склерозе»), пратэст супроць казёншчыны ў людскіх узаемаадносінах («Ода квітанцыі»), асуджэнне драпежніцкіх інстынктаў і прыстасавальніцтва асобных людзей («Пра воўка памоўка»), прагненне праўды («Гора—не бяда, бяда—не гора»)—вось некаторыя матывы зборніка «Тры цішыні».

А. Вярцінскі належыць да тых паэтаў, унутраная настроенасць якіх на голас сучаснасці падпарадкоўвае сабе амаль усе творчыя інтарэсы. Нават мінулае ў яго гаворыць зусім сучаснай мовай. Вось верш «Бурбоны вяртаюцца ў Парыж». Ён мае падзагаловак—«Гістарычны эцюд». Можна задумацца: хіба контррэвалюцыйная падзея мінулага можа неяк закранаць нашу сучаснасць сваім прамым сэнсам? Але ўслухаемся ў рытм верша:

Бурбоны вяртаюцца ў Парыж,
на трон вяртаюцца бурбоны.
...Бурбоны жывучыя, як зло,
на дзіва жывучыя бурбоны.

Гучанне гэтых радкоў выклікае трывогу. Здаецца, чуваць, як б'юць барабаны, папярэджваючы аб небяспецы, заклікаючы да пільнасці. Паэт гаворыць, што пагроза контррэвалюцыі і рэакцыі такая ж пастаянная, як і пагроза зла наогул. Гэта надзвычай глыбокая думка.

Рацыяналізуючы вобразы і стыль, А. Вярцінскі бярэ ход жыцця ў яго вельмі адцягнутым малюнку, апускаючы бытавыя падрабязнасці. Асобны факт яго таксама цікавіць, але толькі тады, калі ён, гэты факт, тыповы сам па сабе, калі на яго аснове лёгка зрабіць абагульненне.

У вершы «Дынамік» нічым не прыкметная падзея—старая жанчына ідзе да радыёпрасіць, каб той паправіў радыё ў яе хаце—прыадкрывае на хвіліну трагедыю чалавечага адзіноцтва. Калі жанчына гаворыць:

Ні сынкоў няма, нікога.
Толькі радзіва адно.
Толькі радзіва—
мне падмога.
Што б рабіла, каб не яно?
І пагаворыць, і паспявае,
добрай ночы жадае мне.
І паплачам з ім, бывае,
як успомнім аб вайне—

то яе словы ўражваюць якраз сваёй будзённасцю, адсутнасцю экспрэсіі, тым, што гора стала такім звыклым, што пра яго гавораць у пераліку звычайных хатніх турбот, хоць яно, гэтае гора, ні з чым не параўнальнае.

За вонкавай бясстраснасцю некаторых вершаў А. Вярцінскага хаваецца гарачы тэмперамент яго лірычнага героя і вострая сацыяльная думка. Верш «Мама мыла раму» таксама пачынаецца з нязначнай па змесце і «халоднай» фразы, нават азбучна простай і з дзяцінства надакучлівай. Паэт жа здолеў так цесна ўвязаць яе з падзеямі, блізкімі яго сэрцу, што яна ўспыхнула нечакана багатым сэнсам.

Манера, якая становіцца ў А. Вярцінскага ўжо звыклай,—бачыць нават у жыццёвай дробязі праяву пэўных грамадскіх працэсаў,—адкрывае цікавыя магчымасці перад ім як паэтам, які робіць сур'ёзную заяўку на інтэлектуальную паэзію. Аднак паэт часам пачынае шукаць паглыбленага зместу там, дзе ён пакуль што не праглядваецца, і тады яму даводзіцца «цягнуць» верш, марна траціць усе намаганні думкі («Пісьмо»). Гэта тым больш кідаецца ў вочы, што большасць вершаў зборніка адразу бяруць у палон і вядуць за сабой мыслісцельнай энергіяй і мыслісцельнай культурай паэта. У вершы «Пахавальнае шэсце» А. Вярцінскі заўважыў распаўсюджаную псіхалагічную асаблівасць людзей — кожны раз успрымаць смерць чалавека як нешта аддаленае і старонняе:

Павольна рухаецца пахавальнае
шэсце.
І вуліца па-свойму прымае яго.
Вуліца прымае яго
краем вока,
краем вуха,
краем сэрца,
прымае рассеяна і няўцямна:
«Хіба паміраюць людзі?»

Сапраўды, прыроджаная жыццярадаснасць чалавека, бесперапынны тэмп жыцця навучылі людзей не думаць пра смерць. Жывыя павінны думаць пра жыццё. Але для паэта няма нічога простага. У такой пазіцыі ён бачыць і небяспеку. Паланенне жыццёвымі турботамі не павінна нараджаць абыякавасці да смерці, бо яно можа пераходзіць у абыякавасць да жыцця і да чалавека. У вершы А. Вярцінскага недзе ў падтэксце б'ецца вядомая думка Хэмінгуэя, што калі звоніць пахавальны звон, то ён звоніць і па табе. І паэт асуджае раўнадушнасць да чужой смерці, асуджае не проста, з элементарнага пачуцця шкадавання, хоць і яно ўпрыгожвае чалавека, а з больш высокага, філасофскага прынцыпу, бо яшчэ ў старажытнасці казалі, што думаць пра смерць—гэта значыць думаць пра жыццё.

Аблюбаваўшы метад паэтычнага роздуму, А. Вярцінскі рэдка звяртаецца да публіцыстычнага закліку. Калі ён і ёсць у некаторых вершах, то не крыклівы, не надакучлівы, нават не гучны. Таму асабліва верыш у шчырасць паэта, калі ён павышае свой голас да публіцыстычнага пафасу, як у вершы «Бой».

Так бы ў цяжкую гадзіну
за праўду стаяць гарой,
як стаяў за Радзіму
артылерыст-герой.
Так бы пераконана
змагацца з сіламі зла,
як з стальнымі драконамі
змагаўся хлопец з Арла.
Паўзуць яны, сілы гэтыя,
у шэрую броню адзетыя,—
колькі іх там? Ого!
А ты:—Агонь! Агонь!
На міг ахопіць трывога,
сумненне стукне ў скроні:
ці будзе яна—перамога?
— Агонь! Агонь! Агонь!
«Вы ж будзьце асцярожныя!»—
хтось крычаў—наўздагон.
А мы, як заварожаныя:
— Агонь! Агонь! Агонь!
Нехта побач баіцца,
глядзіць у кусты з тугой.
А мы не здаём пазіцый:
— Агонь! Агонь! Агонь!
Бачыш, нас абыходзяць,
Здавайцеся, ды і годзе.
А мы ўсё:—Агонь! Агонь!
І зло ляціць пад адхон.
Ляціць усё подлае, пошлае,
коснае... Хто каго?!
Наша слова апошняе:
— Агонь! Агонь! Агонь!

Вельмі характэрная для А. Вярцінскага схільнасць аб'ектывізаваць вобразнасць і стыль сваіх вершаў прымушае яго быць у паэтычнай фразе не толькі скупым, але і афарыстычным. Афарыстычнасць жа можа ўзнікнуць толькі там, дзе ёсць такая глыбіня пазнання і адчування жыцця, што ствараецца, калі можна так сказаць, аж лішак паэтычнага пачуцця і думкі, і тады такой думцы цесна ў звыклай форме выказвання. У зборніку «Тры цішыні» багата ўдалых афарыстычных выразаў або радкоў:

Слава, як вядома, дым.
Справа—у добрай справе.
(«Хто вынайшаў веласіпед?»)
Гора—не бяда, бяда—не гора:
пабыла—сплыла, нібы вада.
Няма праўды—гэта ўжо горай.
Гэта ўжо цэлая бяда.
(«Гора—не бяда, бяда—не гора»)
Нашто бяссрэбранікам серабро—
пасрэдных людзей пасрэднік!
(«Бяссрэбранікі»)
Не ўсе хочуць быць добрымі,
ды хочуць усе дабраты.
(«Ідзі!»)

Сам паэт не можа не адчуваць паэтычнай сілы афарыстычна выражанай думкі. Натуральна, што яму захочацца яшчэ больш узмацніць афарыстычнасць. Але тут яго падсцерагае і небяспека. Яго можа захапіць спакуса фарсіравана, з ходу ствараць афарызмы, пачынаць не з асэнсавання жыцця, а са слоўнай гульні, якая, на першы погляд, таксама як быццам абяцае паэтычную ўдачу. Дзе-нідзе за такі грэх яго варта папракнуць. Нацягнутасць і недакладнасць шырокага абагульнення відаць на такіх прыкладах: «Дабро, пах тэрмасы цеплацелыя» («Дзякуй, тэрмас!»), «Сустрэчы—не здарэнне: імкнуць да зарада зарад» («Сустрэчы»).

У асобных выпадках А. Вярцінскі страчвае кантроль над словам і, паддаючыся дыктату рыфмы, ідзе за ёю, ужываючы дзеля гучання лішнія словы: «Ступіў на пробку ці выпіў стопку?» Наступіць на корак і выпіць чарку—гэта па сэнсу адно і тое ж. Да таго ж, «пробка» і «стопка» ў сэнсе чарка—не беларускія словы. Або:

Будзь шчодрым сам і скупасці
другому не даруй,
збаўляй яго ад скупасці
і самаахвяруй!

Слоў тут шмат, а сказана нямнога, бо паэта «вяла» за сабой рыфма.

Няўдач, вядома, крытыка не павінна апраўдваць. Але няўдачы па характары і прычынах узнікнення бываюць розныя. У зборніку «Тры цішыні», мне здаецца, большасць няўдач (якіх, дарэчы, у зборніку нямнога) ідзе ад празмернага захаплення аблюбаванымі кірункамі паэтычнага пошуку. Таму гэта такія няўдачы, якія спадарожнічаюць поспеху.

У новым зборніку «Тры цішыні» А. Вярцінскі яшчэ больш падмацаваў уласнае, індывідуальнае бачанне свету, даказаўшы здольнасць пісаць аб жыцці зацікаўлена, шчыра і арыгінальна.

В. КАВАЛЕНКА.

Анатоль Вярцінскі. «Тры цішыні». Вершы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

НА ХВАЛІ БРАТНІХ СУСТРЭЧ

Таджыкістан—Беларусь...
Беларусь—Таджыкістан...
Непарушныя масты шчырай дружбы пралягглі паміж дзвюма рэспублікамі, паміж дзвюма літаратурамі.

Год назад на берагах імклівага Вахша, сярод плантацый белага золата Гісарскай даліны, у адгор'ях сівога Паміра пабывалі беларускія паэты і празаікі. Таджыкскія сябры падрыхтавалі ім добрую сустрэчу. Яны паднеслі беларускім гасцям не толькі шчодры хлебсоль, але і ладны стосін кніг—твораў нашай літаратуры на таджыкскай мове. Паэзія Купалы і Коласа, паэзія іх нашчадкаў загаварыла на мове Рудакі і Айні.

Беларусы таксама не засталіся ў даўгу. Да свята таджыкскай літаратуры ў Беларусі, якое скончылася два дні назад, яны пераклалі на родную мову шмат твораў літаратуры братняга Таджыкістана.

Але не толькі ўзаемныя пераклады — сведчанне плённасці і карысці братніх сустрэч літаратараў дзвюх рэспублік. Знаёмства пісьменнікаў з жыццём і культурай братняга народа — гэта і новае творчае натхненне, і новыя вершы, і новыя творчыя задумы.

Тое, што друкуецца ніжэй, толькі маленькая частка творчых здабыткаў, народжаных на хвалі братніх сустрэч.

Антон БЯЛЕВІЧ

СЯБРАМ—ТАДЖЫКАМ

Прывет вам, сябры-пабрацімы!
Сардэчны і нізкі паклон!
Сыны мы адное Радзімы
У садружнасці сённяшніх дзён.

Мы вас, дарагія, чакалі,
Кідалі пагляды ў прасцяг;
Вас нашы дубровы гукалі,
Услалі лістамі вам шлях.

На шлях выбягалі бярозы,
Нібыта жывыя кастры.
— Прывет вам, паэзіі, прозы
Натхнёныя творцы-майстры!..

Мы з вамі, як сонца, пранеслі
Сцяг праўды праз буры, баі.
І вашы, і нашыя песні
У адзіным працоўным страі.

І вашы, і нашыя краскі
Я дружбе вялікай даю...
Заходзьце, сябры, калі ласка,
У сэрца і ў песню маю!

Вось самалёт над гарамі прастуе,
пераляцаем Паміра снягі,
І Душанбе ўжо святлом салютуе,
вабяць, як дома, яго мурагі.

Можна да часу развітвацца з ліхам,
будзе зямных падарожжаў пара...
Чую ля трапа закладзеным слыхам
голас:
«А дзе тут мая сястра!»

І падыходзіць з усмешкай жанчына,
з ранняю косы яе сівізной...
Дзякуй табе, дарагая прычына:
я прыляцела сюды
за сястрой!..

Мы з ёй пра гора і шчасце спявалі,
мы, парадніўшыся, побач былі.
Нас і чынары, і рэкі віталі,
нам салаўі шчабяталі ў галлі.

Будуць трывогі
нябліскай дарогі,
новай сустрэчы настане пара...
Ярка свяціся, Памір яснарогі,
знайся са шчасцем,
сястра
Гульчахра!

Абдуджабор КАХАРЫ

ХМУРЫНКА

Эй, хмурынка — спрытная дзяўчынка,
Жвавае дзіця раздольных рэк,
Ты чаму
Не ведаеш спачынку
І куды спяшаешся спрадвек?

Можа, ты ў жыцці шукаеш цуда
І, мінуўшы трыдзевяць зямель,
То плывеш марудней за вярблюда,
То ляціш імклівей за газель.

Асцярожна шлях свой выбіраеш
І, змяняючыся зноў і зноў,
То вятрам сцюдзёным патураеш,
То дыханню золкіх туманоў.

Ад навалы нават дрэвы гнуцца
І гатовы распластацца ніц.
І табе нялёгка адкаснуцца
Ад грымотных летніх навальніц.

Ты на горы—і яны на горы,
Ты ў даліну—і яны услед,
Быццам хочуць паланіць прасторы
І замкнуць перад табою свет.

Поўная дзявочых летуценняў,
Ты жывеш, як чыстая раса,
Хоць парой ад ласкавых праменняў
З воч тваіх пакоціцца сляза.

Пераклаў Сцяпан ГАУРУСЕЎ.

Еўдакія ЛОСЬ

СЯСТРА

Гульчахры Сулейманавай

Каюся: не для палётаў вышынных
кволыя клеткі істоты маёй.
Але кажу рэактыўнай машыне
«дзякуй» за рэйс над братэрскай зямлёй...

А ты яго
нядбайна абмінула:
Маўляў, навошта
мне чужы цяжар?
І ўсё ж душа адна
хлапечы боль пачула
І прынясла
прыязнасць сваю ў дар.

Сагрэла шчыра,
каб у злую замець
Не захлынуўся
ад самоты я.
І ты цяпер
прыходзіш мне на памяць,
Як даўняя
даверлівасць мая.

Пераклаў Сцяпан ГАУРУСЕЎ.

Рыгор БАРАДУЛІН

■ ■ ■

Дзень пачынаю
Думкаю пра цябе.
...Жоўтае лісце чынары
Дол перасмяглы дзяўбе.

Начэй вераб'іных,
Ліўняў
Не ведаюць арыкі.
Просяць лісты-палахліўцы
Папіць у цябе з рукі.

Горы ношай цяжкою
Цягнуць вякоў тугу...
А я выводжу, як школьнік,
Тваё імя на снягу.

І ад яго, гарачага,
Снег растае.
У бары заінелым бачу
Вочы твае.

Успомніў песню раскосую —
І развярэдзіў жуду:
«Калі сястарэю,
З посахам
Я да цябе не пайду,
Бо посах мой
Першы прыйдзе...»

■ ■ ■

Аб адным я цябе прашу:
Хоць гады у рады прысніся —
Спадзявання майго парашут
Хай раскрыецца хоць унізе.

Нецярпення скачок зацяжны.
Блізка дол... парашут
не раскрыты...
Ходзяць незразумелыя сны,
Як старонкі старога санскрыту...

Таджыкістан,
лістапад 1965 г.

Гафар МІРЗОЕЎ

ЛІРЫЧНАЕ

Маё каханне—
вешчая трывога —
Падобна лёсу
горкай сіраты.
Паклаў я сэрца
ля твайго парога
І думаў,
што яго прытуліш ты.

Аб адным я цябе прашу:
Хоць гады у рады прысніся —
Спадзявання майго парашут
Хай раскрыецца хоць унізе.

Нецярпення скачок зацяжны.
Блізка дол... парашут
не раскрыты...
Ходзяць незразумелыя сны,
Як старонкі старога санскрыту...

Таджыкістан,
лістапад 1965 г.

У Сяргея Грахоўскага і Фатэха Ніязі было ў час Тыдня нямала цікавых, карысных для абодвух паэтаў размоў.



АБРАЗКІ

СІНІЧАЯ ПАРА

Бярозкі з асінкамі ў асеннім убранні. У рыжай аправе пабляклых траў сінеюць пахаладзелыя лужыны і азерцы. Ападаючае з дрэў рознакаляровае лісце тонкай мазаікай жывапісу кладзецца на блакітную роўнядзь вады і пабляклыя травы.

У прыродзе адбываецца вялікае перасяленне.

Распусціўшы па ветры лёгкую павуціну, адпраўляюцца ў сваё невядомае падарожжа малюсенькія павучкі-бакаходы. Вось ужо дзе сапраўды рашучыя. Куды асенні ветрык занясе, там і родны дом будзе.

Журботна курлыкаючы ў асеннім небе, цягнуць у далёкія краіны свае трохкутнікі шэрыя журавы. Ва ўсе крылы спяшаюцца далей ад халадоў дзікія гусі, гаваркія качкі, гракі. Ляцяць птушкі круглыя суткі — удзень і ўначы. Толькі для адпачынку і кармёжкі ненадоўга спыняюцца ў зацішных і кормных месцах.

Але не ўсе нашы крылатыя сябры адпраўляюцца на зіму ў цёплыя краіны. Некаторыя з іх застаюцца разам з намі — бавіць доўгую халодную зіму. І сярод іх — сініцы. Самыя, бадай, вясёлыя і рухавыя птушачкі нашых беларускіх лясоў.

Восенню яны, пакінуўшы ўтульныя лясныя куткі, ціснуцца да чалавечага жытла, спадзеючыся тут знайсці сабе цёплы зацішак і сякі-такі корм.

Прачынаешся іншы раз вераснёўскім ранкам і чуеш за акном у садзе нейкае ажыўленне. Што б гэта? Яшчэ ўчора сад быў маўклівы і пустэльны. А то ж, бач ты, так і грыміць птушынымі галасамі.

Расчыняеш насцеж акно. У хату, разам з ранняй свежасцю, магутным патокам урываецца шматгалосы сінічы шэбет.

«Пі-цы-фру! Пі-цы-фру!» — крычаць вялікія сініцы, пабліскваючы сваім стракатым апярэннем у парыжэлай лістоце дрэў.

«Цю-пі-ці! Цю-пі-ці!» — падпяваюць ім маскоўкі, уважліва аглядаючы кожную шчылінку ў кары яблынь.

«Сінь-сіней! Сінь-сіней!» — высвіствацць маленькія гаечкі, шэрымі клубочкамі падвешваючыся да гнуткіх галінак вішань.

Нешта сваё выводзяць тонкімі галаскамі гранадзёркі, даўгахвостыя апалонікі.

Ад усіх гэтых разнастайных гукаў і звініць асенні сад.

Верасень — сінічая пара. І, трэба сказаць, вясёлая пара. З зямлі ва ўсю яшчэ прэ ўсялякі грыб, трашчыць на моцных хлапчуковых зубах пераспелы лясны арэх, хрумстае яблык. А ў школьных дзённіках ужо з'явіліся першыя, акуратна выведзеныя рукою настаўнікаў, пяцёркі.

ЗАПРАЦАВАНЫ ГРЫБ

Я вельмі люблю восень. А за што—добра і сам не ведаю. Ці мо за яе стракатае ўбранне, у якое яна кожны год так па-майстэрску апранаецца, ці мо за ціхія задуменныя дзянькі, якіх восенню бывае на дзіва шмат, ці мо за ясныя марозныя раніцы — з хрусткай пад нагой апалай лістотай.

Няма восенню, бадай, такога дня, каб я хоць некалькі мінут не пабыў ў лесе альбо ў полі.

Быў я вось так у лесе і тым асеннім днём. Так прыйшоў, без якой там пэўнай мэты ці пільнай патрэбы. Проста бадзяўся па аглухлых палянах, прыслухоўваўся да тых гукаў, якія можна пачуць у гэты час у лесе, дыхаў сыраватым паветрам, што пахне брусніцамі і грыбамі.

Ціха блукаючы па лясных сцяжынках, пачуў я за хмызняком нейкі шорах. Здавалася, быццам нехта асцярожна краўся. Пашамаціць там, пашамаціць, а пасля — бум! — быццам па мячу нагой улупіць. Змоўкне — і зноў за сваё.

Асцярожна іду на гукі.

Вось уперадзе светлая палянка з вялізнай сукаватай сасной пасярэдзіне. Я акінуў вачыма палянку і заўважыў вавёрку. Яна поркалася пад сасной, завіхалася каля цёмна-бурага прыгажуна-баравіка. Памітусіўшыся нейкі час вакол грыба, вавёрка ўзяла яго ў зубы і панесла на дрэва, шоргаючы лапкамі па шурпатай кары.

«Хм, — усміхнуўся я,—рыжуха грыбы на зіму нарыхтоўвае».

Узбіраючыся на дрэва, яна зачапілася грыбам за сук. Цяжкі баравік выслізнуў з зубоў і шлёпнуўся на зямлю — бум! Незадаволена цокаючы, вавёрка хуценька слізганула з дрэва на зямлю, схапіла ўпушчаны грыб і зноў на сасну. Але варта было ёй дабрацца да таго сука, як грыб зноў падаў долу.

Вядома, восеньскія дні кароткія, і дарэмна згублены адзін асенні дзень халоднай зімой можа каштаваць вавёрцы жыцця. Я вырашыў дапамагчы звярку.

Заўважыўшы мяне, вавёрка хуценька пабегла на дрэва і схавалася ў густой хвоі.

Я падняў з зямлі ўпушчаны ёю грыб і паклаў яго на шурпаты сук, які замінаў звярку ў працы. Паклаў, а сам схаваўся за куст — паглядзець, як вавёрка пакарыстаецца маёй паслугай.

Счакаўшы нейкі час, вавёрка выбралася са свайго сховішча. Заўважыўшы пакладзены мною грыб на суку, яна, мякка перескокваючы з галінкі на галінку, спусцілася крыху ўніз. Пасля скокнула яшчэ ніжэй — да баравіка. Абнюхала яго і, зняважліва фыркнуўшы, скінула з дрэва. Потым саскочыла на зямлю, сарвала тут жа на палянцы худзенькі падбярозавік і, нават не зірнуўшы на цудоўны баравік, што ляжаў пад сасной, панесла яго на дрэва.

— Вось табе і на! — здзівіўся я. — Якая ганарліўка! Няхай, выходзіць, лепей будзе нягеглы падбярозавік, ды затое свой, запрацаваны.

ПА РЫЖЫКІ

Цудоўныя асенні паходы па рыжыкі.

Лес у гэты час стаіць у нейкім глыбокім роздуме і забыцці. Прамытыя дажджамі пянькі і сцяжынкі востра пахнуць грыбамі. Не чутно ў лесе гучных птушыных песень.

Цішыня. Толькі часам вавёрка скіне з дрэва шышку. Ад іх глухіх удараў аб сырую асеннюю зямлю ўздрыгваюць пад кустамі зайцы, спуджана пішчаць у апалай лістоце палёўкі.

Хітры асенні грыб рыжык! Не ведаючы яго звычак, можна дзень па лесе прашвэндацца, ды так з пустым кошыкам і дадому вярнуцца. Але як бы рыжык ні хаваўся, а кошыка вопытнага грыбніка яму, вядома, не мінаваць.

Абышоў я ўвесь барок, а ў кошыку пакуль што — ні грыба. «Куды ж яны, ліха на іх, папрападалі?»

Пастаіш, падумаеш вось так, ды і мільгане раптам думка: «А ці не там, часам, га?»

Падыходзіш да рыжага лапніку, заваленага прэлым лісцем, паднімаеш яго.

— Ну, вядома ж, тут! Дзе ж ім яшчэ быць!

Вось яны, быццам тыя хлапчукі, што насваволі, збіліся ў цесны грудок і прыціхлі, напалохана пазіраючы ўгору.

Далей паднімеш лапнік і там таксама — рыжыкі. Хрумсткія, духмяныя...

Такая ўжо завядзёнка ў мяне: назбіраўшы поўны кошык лясных дарункаў, раблю невялікі адпачынак. Дзеля гэтага адшукваю ўтульную лясную палянку, збіраю сухое ламачча і раскладаю цяпельца. Выбіраю ў кошыку самы крамяны маладзенькі рыжык, насаджваю яго на завостраны бярозавы дубчык, пасыпаю соллю і пачынаю смажыць. На агні рыжык хутка блякне, губляе свой сінявата-аранжавы колер, пачынае тонка сіпець, пузырыцца, а па ўсёй паляне плыве прыемны пах. Засмажаны такім чынам рыжык надта духмяны і смачны.

Гэтай трапезай і канчаецца кожны мой паход па рыжыкі.

Дальбог: той, хто не хадзіў восенню ў лес па рыжыкі, той не зведаў сапраўднай паэзіі грыбных паходаў.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У Гродзенскім абласным драматычным тэатры адбылася прэм'ера спектакля па камедыі польскага драматурга Т. Кажушніка «Цэвыркун». У спектаклі, які паставіў галоўны рэжысёр тэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Струнін, побач са старымі майстрамі сцэны заняты і маладыя акцёры — нядаўнія выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.

На здымку — заслужаная артыстка БССР Ганна Панкрат у ролі пані Завальскай і маладая актрыса Вольга Клебановіч у ролі Зулі.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

КІНО

ДОЎГАЯ І ЦЯЖКАЯ ДАРОГА

...Ён едзе па сонечнай дарозе, вясёлы і горды хлопец Хасан-арбакеш. Ён спявае песню, у якой гучыць адгалоскі нядаўніх гарачых і жорсткіх сутычак, яшчэ гавораць пра некага «Даўлетбай», замест «таварыш Даўлет». Яшчэ рухаюцца ўздоўж дувалаў безаблічныя фігуры пад чорным пакрывалам, і ў начной цішыні, а бывае і сярод белага дня, пачуецца раптам стрэл.

Але настойліва, нястрымна людзі ломяць стары лад, спрадвечныя традыцыі і будуюць новае жыццё — для сябе, для іншых, для ўсіх.

У гэты час і пераносіць нас новая карціна «Хасан-арбакеш», пастаўленая на студыі «Таджыкфільм» рэжысёрам Барысам Кімягаравым.

Паэма народнага паэта Таджыкістана Мірзо Турсун-задэ шырока вядомая. Цяпер са старонак кнігі яе герой перайшоў на экран.

Нам думаецца, Хасан-арбакеш палюбіцца і гледачам. Гэта хлопец з народа, у мінулым батрак, якому рэвалюцыя дала ўсё. Яна зрабіла яго свабодным, усяліла веру ў свае сілы. Яна дала яму работу па душы. Гэта ж, сапраўды, прыемна ездзіць па дарогах, вазіць людзей і тавар, быць самому сабе гаспадаром! Ды яшчэ на добрым кані, якога гадаваў ён для бая, а новая ўлада падарыла яму. Цяпер яму ад жыцця і жадаць больш няма чаго. Ёсць праца, ёсць дзяўчына, якую ён кахае і якую выкупіць сабе ў жонкі, як толькі назбірае на калым...

Вось такім мы бачым Хасана ў пачатку яго дарогі.

Што ж, па кнігах ды па фільмах нам нібыта ўжо знаёмы гэты шлях многіх. Гэты герой, яго барацьба за сябе і з сабой, яго памылкі і сталенне.

Але на гэтай, самім жыццём створанай канве, аўтарам удаецца выпісаць узор яркага, своеасаблівага, сапраўды нацыянальнага характару. У ім, на нашу думку, галоўная і прынцыповая ўдача фільма.

Менавіта вобраз Хасана-арбакеша захоўвае і даносіць да нас высокае эмацыянальнае гучанне паэмы. Рэжысёру і маладому акцёру Бімбулату Ватаеву ўдалося, захаваўшы лепшае ў традыцыі стварэння народнага характару, знайсці сучаснае яго вырашэнне. Барыса Кімягарава можна павіншаваць з дакладным выбарам выканаўцы галоўнай ролі — ігра Ватаева (гэта яго першая вялікая работа ў кіно) уражвае багаццем палітры, глыбінёй і шчырасцю. Ён стварае характар нязломны, моцны, шчодры. Яго Хасан — просты, непісьменны хлопец, але колькі ў ім прыроджанага розуму, годнасці, дабраты! Ён праўдзіва ўсім — і ў пластыцы, і ў псіхалагічным малюнку, і ў кожным сваім учынку. Гэтая паўната стварае тую ступень мастацкага абагульнення, за якой паўстае маштабнасць апавядання аб гістарычных зрухах і пераменах, аб росце новага ў свядомасці людзей.

Удалы і вобраз мудрага кавалля ў таленавітым выкананні заслужанага артыста Таджыкскай ССР Г. Заўкібекава — гэта сябар і антыпод Хасана, ён прыняў новае жыццё адкрыта і даверліва, ён ведае і разумее больш за маладога арбакеша, але нідзе не навязвае яму свайго разумення жыцця, ён пераконвае дзеяннем.

На жаль, менавіта гэтай праўдзівасці і глыбіні не хапае жанчым вобразам фільма, асабліва маладой настаўніцы Зейнаб. Цяжка абвінаваціць у гэтым актрысу М. Камалаву, тут, відаць, справа ў праліках драматургіі.

Аўтары імкнуцца прачытаць паэму як эпічнае палатно: мы бачым будаўніцтва першай чыгункі, школу, завод, мітынг, базар, горы, у якіх яшчэ хаваюцца рэшткі банд басмачоў... Едуць вучыцца таджыкскія хлопцы, ідуць па дарогах ніколі не бачаныя тут машыны...

...Круцяцца велізарныя колы лёгкай арбы, едзе Хасан-арбакеш па родным краі, выбіраючы свой шлях, сваю дарогу. Не, нялёгка даецца яму кожны крок уперад... Але мяняецца жыццё, мяняюцца людзі, мяняецца і сам наш герой. І няхай у фінале фільма Хасан не перасядзе з арбы за руль аўтамабіля, — мы разумеем: ён рушыць па дарозе да нас, ідзе з намі, са сваім народам...

Э. МІЛОВА.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

СТЫКОЎКА КАСМІЧНЫХ КАРАБЛЕЎ.

Фотаэцюд Тамары МЕКЧАНКА (Гомель).

Вальдэмар Пансо і яго радасці

У свой час на старонках часопіса «Театр» было апублікавана «Пісьмо да Станіслаўскага», напісанае ў форме гутаркі. Яно было поўнае глыбокага роздуму аб ролі мастацтва, аб золаташукальніцтве ў ім, аб наватарстве, аб тым, што сцэне патрэбен разумны, не разважлівы, а іменна разумны акцёр, які павядзе тэатр у заўтра. І подпіс быў: «Вечна аддадзены Вам Пансо Вальдэмар, сын Ханса з горада Таліна».

У Эстоніі імя Пансо цяпер не вядома толькі таму, хто не ходзіць у тэатр, не глядзіць тэлевізійных перадач, не слухае радыё і не чытае газет. Бадай, ён належыць да плеяды тых шчаслівых людзей, для якіх час надзвычай спрыяльны. Захацеў Пансо стаць акцёрам — стаў ім. Пацягнуўся да рэжысуры — паехаў у Маскву вучыцца, пачаў ставіць спектаклі. Паспрабаваў свае сілы ў кіно — атрымалася. Адчуў з узростам патрэбу ў вучнях — стаў кіраваць кафедрай сцэнічнага мастацтва. Потым напісаў кнігу пра талент і працу акцёра, абараніў дысертацыю. І, нарэшце... Але пра гэта пазней.

Як працуе гэты чалавек? Я атрымала дазвол назіраць і суправаджаць яго на працягу аднаго дня. Бо з нітак дзён сплятаецца ўзор дзесяцігоддзяў. З сум працы аднаго дня складаецца праца жыцця.

З самай раніцы я не адважылася званіць. Пазваніла ў дзевяць — ён на рэпетыцыі. Здаецца, на тэлебачанні — адказалі мне. З самай раніцы мне давялося даганяць Пансо.

У тэлевізійным тэатры гараць юпітэры. Аператары запраўляюць свае камеры. Ніякіх лішніх рэквізітаў. Дыпламанты кафедры сцэнічнага мастацтва іграюць сучасную камедыю «Гусінае пяро». Чатыры гады назад хлопцы пачыналі, а цяпер за іх плячыма не толькі лекцыі, заняткі, практыкаванні і рэпетыцыі, але і самастойныя спектаклі.

Калі скончыцца спектакль і апошні акцёр «выйдзе з кадра», усе збяруцца ў пакоі, што насупраць. Там сядзіць вялікі чалавек з буйным тварам, высокім адкрытым лбом, сівой галавой. Гэта і ёсць Вальдэмар Пансо.

Пансо дзеліцца сваімі ўражаннямі: у гэтай сцэне прагучалі фальшывыя інтанацыі, другую перагрузілі лішнімі дэталямі... І яшчэ шмат розных меркаванняў.

Мы выйшлі на вуліцу. Невялікі перапынак, можна выпіць кавы. У руках у Пансо цяжкі, не першай маладосці партфель. Там кнігі, яны падрыхтаваны ў падарунак фінскім акцёрам. Іх стрэл закончыліся, позна ўвечары яны пакінуць Талін. Перапынак скончыўся. Пансо накіроўваецца на вуліцу Хар'ю, у Саюз пісьменнікаў Эстоніі. Зноў чацвёрты курс. Зноў рэпетыцыі.

Скупыя ўмоўныя дэкарацыі. Уно Варк становіцца на невысокі п'едэстал. Ён успамінае аб старых легендах, старажытных і мудрых, як свет. Яго голасам будзе зараз з намі гаварыць аўтар «Назад да Мафусаіла» — Бернард Шоу.

— Стоп! — перабівае Пансо. — Дрэнна! Вельмі дрэнна! Нельга проста дэкламаваць вывучаны тэкст. Патрэбна жывая думка. Вашы словы першыя, вы аўтар, вы возьмеце гледача за руку і павядзяце яго ў свет далёкі, у якім выспяваў першы вопыт, дзе першыя людзі рабілі першыя адкрыцці.

Я разумею, тут лабараторыя. Тут ідзе ювелірная, сур'ёзная работа са студэнтамі, з тымі, каго заўтра назавуць прафесіянальнымі акцёрамі. А сцэне патрэбен разумны акцёр, я гэта памятаю з пісьма Пансо да Станіслаўскага і ведаю гэта, як глядач.

З-за рэпетыцыі Пансо трошкі спазняецца на пасяджэнне Мастацкага савета ў тэатры драмы імя В. Кінгісепа. У тэатры ідзе гаворка пра будучыя вызначныя спектаклі. А запісная кніжка падказвае: у чатыры пачынаюцца заняткі па акцёрскаму мастацтву з першакурснікамі, у сем гадзін вечара — зноў Саюз пісьменнікаў, але на гэты раз не на рэпетыцыю. Таліндзы прыйдуць у пакаёвы тэатр глядзець дыпломны спектакль. А потым, зусім позна, амаль на мяжы новага дня Пансо пойдзе праводзіць на вакзал фінскіх сяброў.

Так і прайшоў той чацвер, калі мне давялося стаць цэнем шчаслівага чалавека. Доўгі перапоўнены дзень.

А цяпер пра тое самае «нарэшце», якое ўпаміналася ў пачатку артыкула. Пансо атрымаў свой тэатр, Тэатр юнага гледача. Сёлетняй восенню «нованароджаны» пачынае свой другі сезон, і пачынае яго з «Гамлета». Спектакль ставіць заслужаны дзеяч мастацтваў Эстонскай ССР, кандыдат мастацтвазнаўчых навук Вальдэмар Пансо. Нястомны чалавек, надзелены вялікай фантазіяй і вялікай энергіяй маладосці. Ён сапраўды малады. З пуцявых нарысаў Пансо, напісаных ім пасля паездкі ў Англію, мы даведваемся пра яго ўзрост: ён аднагодак англійскай каралевы, а ёй... за дваццаць.

Таццяна АПЕКІНА.
(АДН).

Вінцэнты Кшыжэўскі—адзін з выдатных скульптараў-разбяроў Мазовіі.

Тэафіль Ацэпка. Казачная экзотыка яго карцін — адна з тэм палемікі вакол паняцця народнай творчасці.

АРПРЭС ДЛЯ ЛІМА

РАЗЕЦ І ПЭНДЗАЛЬ У РУКАХ «НАІЎНЫХ»

У Польшчы, таксама як у многіх краінах з высакаразвітай тэхнікай, традыцыйнае народнае мастацтва паступова страчвае сваю першаснову і згасае. Гэты працэс можна, аднак, затармазіць, калі знойдзецца абаронца і апякун народных умельцаў, здольны ажывіць адміраючыя традыцыі. У Польшчы такі апякун знайшоўся: дзяржава, якая не шкадуе сродкаў для падтрымання народнай творчасці. Не засталіся ўбаку і рэгіянальныя (абласныя) грамадскія аб'яднанні. Добрых вынікаў у гэтай справе дамаглася шырока вядомая, і не толькі ў Польшчы, «Цэпелія» (Цэнтральны саюз народных і мастацкіх промыслаў) — арганізацыя, якая купляе і прадае творы народнага мастацтва і адначасова забяспечвае народным умельцам адпаведныя ўмовы работы.

Дзякуючы гэтай усебаковай дапамозе, за апошнія дваццаць год у Польшчы зноў ажывіліся ўсе галіны народнай творчасці.

Народныя ўмельцы не мараць, зразумела, пра славу і вядомасць. Яны твораць толькі дзеля таго, каб задаволіць уласныя ўнутраныя патрэбы. Іншы раз яны нават утойваюць сваю творчасць ад старонняга вока. Аднак пэўныя творы народнага мастацтва: рэчы хатняга ўжытку, упрыгожанні, ткацкія вырабы і інш.—маюць непасрэдную практычную, прыкладную каштоўнасць. Вось чаму параўнальна лёгка знайсці аўтараў твораў.

Трошкі інакш абстаіць справа з пошукамі скульптараў, разбяроў і жывапісцаў. Часцей за ўсё яны твораць толькі для сябе, нікому не паказваючы сваіх работ, і тым большыя заслугі арганізацый і аматараў народнага мастацтва, якія змаглі адкрыць у Польшчы шматлікую групу самабытных майстроў разца і пэндзля. Іх творы сталі здабыткам польскай культуры, аказалі ўплыў на прафесіянальны жывапіс і скульптуру. На выстаўках у Польшчы і за рубяжом яны выклікаюць усеагульнае захапленне.

Раскажам пра лёс некаторых народных майстроў. Марыян Пшэдпелскі, карэнны варшавянін, яшчэ да вайны пераехаў у адну з вёсак Паўночнай Мазовіі. Ужо тады яго вабіла этнаграфія. Пасля вайны Пшэдпелскі пачаў свае пошукі. Ён наведваў старыя дамы, старыя сем'і, якія спрадвечна жывуць тут, уважліва абследаваў касцёлы і пагосты. У адным месцы ён знайшоў надмагільны помнік своеасаблівай работы, з разной фігуркай, прымітыўная прыгажосць якой ўразіла яго. Пад помнікам, на магільнай пліце, ён прачытаў прозвішча: Скіржынская. Потым ён пазнаёміўся з Вацлавам Скіржынскім, які высякаў фігуры мадоннаў, аратых. Знайшоў сталяра Мечыслава Рушкоўскага. Яго разныя з дрэва ягняты і ослікі выклікалі вялікую цікавасць у знаўцаў народнага мастацтва. У невялікіх фігурках было штосьці манументальнае. Сёння работы Рушкоўскага купляюць музеі, яны бываюць на зарубежных выстаўках, атрымліваюць прэміі.

Пшэдпелскі пазнаёміўся таксама з Аленай Галямбёўскай, фантазія якой стварыла казачных птушак, з Вінцэнтам Краеўскім, які выразае з дрэва фігуркі святых, што нагадваюць знясіленых цяжкай працай мужыкоў. Пшэдпелскі стаў сябрам і апекуном многіх іншых народных умельцаў.

З гадамі адкрываліся багатыя «залежы» народнага мастацтва і ў Горным Падгаллі. Праўда, гэты раён здаўна славіўся сваім самабытным мастацтвам, але паступова яно ператваралася ў рамесную «серыйную» вытворчасць сувеніраў, якія раскупляліся сотнямі тысяч адпачываючых і турыстаў. Здавалася, што ў гэтым раёне не магло нічога захавацца ад чыстага народнага мастацтва. Тым не менш у Падгаллі выяўлены народныя мастакі, якія прадаўжаюць выдатныя традыцыі сваіх папярэднікаў.

Адзін з іх — Юзэф Янас. Ён пабудаваў сабе дом, вытрыманы ў мясцовым горскім стылі, і жыве ад продажу разных фігур. Яго ніхто не можа прымусіць зрабіць нешта на заказ. «Тое, што я ствараю, павінна выходзіць ад мяне, — гаворыць ён аматарам народнай разьбы. — Хочаце, купляйце, а не, дык не. Тое, што я прадаю, вы знойдзеце толькі ў Янаса». І сапраўды, ніхто, апрача Янаса, не выразае з ліпавага кругляка фігуры смуткуючага Хрыста, які абапіраецца на дзве стройныя елкі, з каронаю з яловых шышак на галаве. Непаўторныя Яносікі — фігуркі легендарнага горнага разбойніка.

Калі б хто-небудзь паспрабаваў нанесці на карту польскай народнай культуры месцы, дзе працуюць самабытныя майстры, дык яму давялося б размаляваць усю карту. У самым цэнтры Польшчы размешчана вёска Дамброва Зялёна, дзе жыве Ян Ляменцкі — гаспадар невялікага зямельнага ўчастка, «сезонны» ляснік, каменачос. Ён запісвае ў сваім дзённіку думкі аб свеце, месцы і знаходкі, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Ён ведае, што ў ім ёсць нешта такое, чаго не ведаюць іншыя, і ён імкнецца перадаць гэтае нешта ў сваіх творах. Ён стварае фігуры, у якіх, на яго погляд,